ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (з карэтным дадаткам „Прафрух“)

На 1 мес.	— 90 к.
„ 3 мес.	2 р. 60 к.
„ 6 мес.	5 р. —
„ 12 мес.	9 р. 75 к.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок пошп. пасьля тэксту—50 к., іншагародняя абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Зьвыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. ураднаму.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЬ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	10-74
Сакратар	6-19
Партсэктар	13-80
Сэктар інфармацыі	13-80
Начны рэдактар	6-42
Галоўная кантора	7-81
Аддзел падпіскі	7-81
» абвестак	7-81

НЯДЗЕЛЯ, 27 ліпеня 1930 г.
№ 173 (3771)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

БАЛЬШАВІЦКАЯ ЎБОРКА УРАДЖАЮ—

самы верны агітатар за калектывізацыю

Ударным правядзеньнем уборачнай кампаніі і правільным разьмеркаваньнем прыбыткаў у калгасах яшчэ больш узмоцнім калгаснае будаўніцтва, нанясем руйнуючы ўдар па кулаку і яго агентах—правых апартуністых

ДА СУРОВАЙ АДКАЗНАСЬЦІ ТЫХ, ХТО ЗРЫВАЕ УБОРКУ. БІЦЬ ПА НЯДБАЙНАСЬЦІ І БЮРАКРАТЫЗЬМЕ У ПАДРЫХТОЎЦЫ, ПА АПАРТУНІСТЫЧНАЙ СТАЎЦЫ НА САМАЦЕК

На грамадзкі буксір раёны і асобныя калгасы, якія адстаюць

Ураджай ідзе

АБ ПАРАДКУ РАЗЬМЕРКАВАНЬНЯ УРАДЖАЮ І ДАХОДАЎ У КАЛГАСАХ

ПАСТАНОВА КАЛГАСЦЭНТРУ

(Усім рэспубліканскім, краявым (абласным) калгасаюзам)

Рашаючае значэньне ў сучасны момант набывае правільнае разьмеркаваньне рэзультатаў працы і ўраджаю ў калгасах. Урад і Калгасцэнтр ужо далі асноўныя дырэктывы па пытаньні аб разьмеркаваньні даходаў і ўраджаю. Аднак, цэлы рад калгассаюзаў дапусьцілі шмат грубых скрыўленьняў гэтых дырэктыў і пастаноў ураду і Калгасцэнтру. Калгасцэнтр СССР, зварачаючы ўвагу калгассаюзаў на недапушчальнасьць падобных скрыўленьняў асноўных дырэктыў, катэгарычна прапануе калгассаюзам у сваіх паказаньнях калгасам кіравацца раней данымі дырэктывамі ўраду і Калгасцэнтру, а іменна:

а) Разьмеркаваньне даходаў і ўраджаю павінна адбывацца, як праціла, па колькасьці і якасьці затрачанай працы;

б) 5 проц. валавога ўраджаю і даходаў ад абагуленай малочнай жывёлы калгасу разьмяркоўваць паміж членамі адпаведна цаны абагуленага імі даходу і маемасьці.

в) Адлічэньні ў непадзельныя і абагуленыя фонды адбываюцца за вылікам:

1. Насенфонду; 2) фуражнага фонду для абагуленай жывёлы; 3) адзінага с.-г. падатку; 4) выдаткаў на ўплату страхавых узносаў па маемасьці і пасевах.

г) Разьмер адлічэньняў у непадзельны фонд у гэтым годзе павінен быць вызначаны ў 10 проц. і ў абагулены фонд і патрэбы, дапамогу непрацаздольным, прэміяльныя і г. д. — 5 проц.

д) Розныя іншыя адлічэньні ў абагуленыя фонды (арганізацыя грамадзкага харчаваньня, ясьлі і г. д.) могуць адбывацца выключна ў добраахвотным парадку, па пастанове агульнага сходу калгасу.

е) Разьмеркаваньне кармоў рабіць, выходзячы з патрэбы забясьпечаньня жывёлы калгаснікаў, як правіла, у лік аплаты працы.

ж) Азімыя пасевы членаў калгасу, зробленыя імі ў індывідуальным парадку да ўваходу ў калгас, застаюцца ў распараджэньні пасеўшчыкаў.

Калгасы павінны аказваць дапамогу ва ўборцы гэтых пасеваў. Праўленьне Калгасцэнтру прапануе зараз-жа адмяніць усе паказаньні калгасам па пытаньні аб разьмеркаваньні даходаў, якія супярэчаць гэтым дырэктывам ураду і Калгасцэнтру.

Шырока папулярызаваць паказаныя вышэй дырэктывы калгасам (лістоўкі, артыкулы і г. д.), не абмяжоўваючыся толькі фармальным давядзеньнем да ведама калгасаў гэтых дырэктыў. Парадак разьмеркаваньня даходаў і ўраджаю вызначаецца ВЫКЛЮЧНА ПАСТАНОВАЙ АГУЛЬНАГА СХОДУ ЧЛЕНАЎ КАЛГАСУ.

НАМЕСЬНІК СТАРШЫНІ ПРАЎЛЕНЬНЯ КАЛГАСЦЭНТРУ
ТАТАЕЎ.

На радасьць кулаку

Бюракраты губяць калгас

ЧЭРВЕНЬ. (Брыгада «Зьвязды»). Кулакі і падкулачнікі ў Грэбеньскім сельсавеце настойлівa імкнуцца разваліць калгас імя Варашылава. Заможнікі самавольна забралі ў калгаснікаў сенажаць. Кулацкія элемэнты развяць калгасныя пасевы і адкрыта цкуюць калгаснікаў. Наогул, у гэтым сельсавеце кулакі праяўляюць выключную актыўнасьць. Нядаўна сельсавет адвёў індывідуальным бядняцкім гаспадаркам зямлю пад папар. Мясцовыя кулакі абнаглелі да таго, што прагналі беднякоў-індывідуальнікаў і самі ўзаралі гэту зямлю.

Калгас імя Варашылава да гэтага часу не зямляўпарадкаваны. Усе калгасныя пасевы перарэзаны індывідуальнымі палоскамі. Заможнікі карыстаюцца гэтым і прыступаюць да ўборкі калгасных пасеваў. Кулакі, напрыклад, забралі ад калгасу яго пасевы бульбы. Цераспалосіца вядзе калгас да развалу. Калгаснікі ня раз прасілі раённыя ўстановы правесьці зямляўпарадкаваньне. Аднак, ні адна просьба калгасу ня прынесла ніякіх рэзультатаў. Раённыя работнікі лічаць немагчымым правесьці зямляўпарадкаваньне ў калгасе, бо «там хутарская сыстэма».

На радасьць кулаку мясцовыя бюракраты спрыяюць развалу калгасу. Гэтага пельга дапусьціць.

П.

Не падрыхтаваліся

ПОЛАЦАК, 25. (Брыгада «Зьвязды») У Вульскім раёне падрыхтоўчая работа да ўборкі ўраджаю праведзена дрэнна. Раённыя ўстановы надзвычайна позна склалі пляны ўборкі ўраджаю і асеньняй пасеўнай кампаніі. Раённы плян быў пасланы на месцы толькі тады, калі ўжо пачалася ўборачная кампанія. 2/3 усіх калгасаў раёну ніякіх вытворчых плянаў ня маюць. Раённы камітэт партыі не мабілізаваў партыйную арганізацыю па ўдарнае правядзеньне ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі.

Дубанін.

Няма машын

Акрпаляводсаюз зрывае плян завозу

ЧЭРВЕНЬ, 26. (ПА ТЭЛЕГРАФУ). МЕНСКІ АКРПАЛЯВОДСАЮЗ ЗАМЕСТ ВЫЗНАЧАНЫХ ПАВОДЛЕ ПЛЯНУ 22 ЖНЯЯРАК ПРЫСЛАЎ У ЧЭРВЕНЬСКІ РАЁН ТОЛЬКІ 7 ШТУК. КОННЫХ ГРАБЕЛЬ ПАВІННА БЫЦЬ ДАСТАЎЛЕНА 7. ЧЭРВЕНЬСКІ РАЁН НЕ АТРЫМАЎ НІ АДНЫХ КОННЫХ ГРАБЕЛЬ. ШТОДЗЁННЫЯ НАПАМІНАНЬНІ РАЙПАЛЯВОДСАЮЗУ НІ ДА ЧАГО НЯ ПРЫВОДЗЯЦЬ. АДСУТНАСЬЦЬ ЖНЯЯРАК І КОННЫХ ГРАБЕЛЬ ПАГРАЖАЕ ЗРЫВАМ УБОРАЧНАЙ КАМПАНІІ. ПРОСІМ УЗЬДЗЕЙНІЧАЦЬ НА АКРПАЛЯВОДСАЮЗ.

Сэкратар раённага камітэту КП(б)Б РАЙ

Мертвыя пляны

ВІЦЕБСК. (Брыгада «ЗЬВЯЗДЫ»). ВЫСАЧАНСКІ раён зусім нездавальняюча падрыхтаваўся да ўборачнай кампаніі. Раённы плян уборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі да сельскіх саветаў не даведзен. Сельсаветы сваіх плянаў уборкі ня маюць. У калгасах вытворчыя пляны ўборкі ўраджаю і асеньняй пасеўнай кампаніі складзены, але яны не даведзены да калгаснікаў. У калгасных плянах ёсьць шмат недарэчнасьцяй: не паказаны тэрміны выкананьня тэй ці іншай работы, не падлічана рабочая сіла і г. д.

Большасьць усіх гэтых плянаў засталася мёртвымі паперкамі. Уборачная кампанія, якая разгортваецца, праходзіць самацёкам, без патрэбнай плянавасьці. Рамонт уборачных машын і падрыхтоўка памяшканьняў для збожжа праходзяць дрэнна. У асобных калгасах рамонт яшчэ не распачаты.

Рабочая сіла на палявых работах скарыстоўваецца без усякага пляну. У складзеных вытворчых плянах няма патрэбных паказаньняў па разьмеркаваньні рабочай сілы. Рабочыя брыгады ня складзены. Пытаньне аб пераводзе калгаснікаў на зьдзельшчыну ня вырашана.

Многія калгасы адчуваюць вялікую нястачу ў рабочай сіле. Недахват рабочай сілы па раёне дасягае каля 20.000 рабочых дзён. Па некаторых калгасах нястача рабочых рук стварае катастрафічнае становішча. У калгасе «САЦЫЯЛІСТЫЧНЫ БАЦЬКАЎШЧЫНА», напрыклад, не хапае 5.235 рабочых дзён, у калгасе «КОЛАС» не хапае 3.143 дні, у калгасе «СЕРП і МОЛАТ» — 1.738, у калгасе «ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК» — 1.725 і г. д. Раённыя і прафсаюзныя арганізацыі не аказалі калгасам ніякай дапамогі ў забесьпячэньні рабочай сілай.

Увесну калгасы і індывідуальны сэктар раёну засеялі шмат лёну. У сувязі з гэтым, у Высачанскім раёне распачата будаўніцтва ільнаапрацоўчага камбінату. Але будаўніцтва ідзе злачынна марудныміі тэмпамі. Райкалгассаюз нават страціў упэўненасьць, што будаўніцтва камбінату будзе скончана ў гэтым годзе. Будаўніцтва сьвінарнікаў і сіласных ям у раёне яшчэ не разгорнута. Калгасы ня выкапалі ні аднэй сіласнай ямы. Лесаматар'ял на пабудову сьвінарнікаў знаходзіцца ў лясох. Усе будаўнічыя пляны павісьлі ў паветры. Так далей быць ня можа.

ФРОЛАЎ.

Ударнікі палёў

Калгасы Жлобінскага раёну канчаюць уборку. Рабочыя і чырвонаармейскія брыгады на палёх калгаснікаў і індывідуальнікаў. Калгасы „Чырвоная Зорка, „Чырвоная Беларусь“ „імя Войкава“, „Вольная праца“ і інш. убіраюць азімыя калектыўна. Цэлыя вёскі ўступаюць у калгасы

ЖЛОБІН, 26. (Брыгада «Зьвязды») Уборачная кампанія ў Жлобінскім раёне праходзіць з посьпехам. Перадавыя калгасы дапамагаюць больш слабым калектывам і індывідуальным бядняцкім гаспадаркам.

Жлобінскія чыгуначнікі і рабочыя будаўнікі арганізавалі 4 брыгады для дапамогі калгасам ва ўборцы. Брыгады, якія яднаюць 80 чыгуначнікаў і будаўнікоў, ужо некалькі дзён працуюць на калгасных палёх.

Чырвонаармейскія часьці з свайго боку аказваюць актыўную дапамогу калгасам ва ўборцы ўраджаю і падрыхтоўцы да асеньняй кампаніі. Чырвонаармейцы №-скага эскадрону па ўвесь час уборкі выехалі ў падшэфны калгас, дзе працуюць ужо другі тыдзень. Некалькі чырвонаармейскіх брыгад працуюць на палёх індывідуальнікаў-беднякоў, дапамагаючы апошнім убраць ураджай. 80 дэлегатак Жлобіну арганізавана выехалі ў калгас «Новае жыцьцё» (в. Бухарына), дзе дапамаглі калгаснікам убіраць жыта.

Першым у Бабруйскай акрузе абвясьцілі сябе ўдарным па правядзеньні ўборкі калгас «Расьсьвет - Пераможца». Калгас не абмежаваўся адзнымі абяцаньнямі, а на справе паказаў сапраўды ўдарныя баявыя тэмпы ўборкі. За 6 дзён работы калгаснікі ўбралі боль 150 гэкт. засеваў (50 проц. азімых і ячменю).

У калгасе «Ясны шлях» калгаснікі абвясьцілі сябе ўдарнікамі і дружна ўзяліся за ўборку ўраджаю. У бліжэйшыя дні калгас «Ясны Шлях» канчае ўборку азімых і ячменю. У калгасе арганізавана 7 ударных брыгад. Лепшы прыклад ударнай работы паказвае старшыня праўленьня калгасу бядняк Лямцаў Ф. А. Тав. Лямцаў разам з іншымі калгаснікамі ад усходу і да захаду сонца працуе на палёх. Палявод Бадзелаў Пятрусь, Арлоў—сакратар камсамольскай ячэйкі, Андрзеў—рабочы-чыгуначнік, зьяўляюцца ініцыятарамі сацыялістычнага спаборніцтва і першымі ўдарнікамі ў калгасе. За імі ўвесь калгас стаў ударным. «Ясны Шлях» убірае ўсе азімыя, засеяныя індывідуальна, калектыўным парадкам.

Члены калгасу імя XII-годзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі сьледам за калгасам «Расьсьвет - Пераможца» ў баявой гатоўнасьці выйшлі на ўборку. На палёх працуюць 6 ударных брыгад, якія за 7 дзён убралі 60 гэкт. ячменю і 74 гэкт. жыта (100 проц. усяго ўраджаю збожжавых культур). Калгас імя XII-годзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі рыхтуецца да абмалоту. Падрыхтаваны ўсе гумны, малатарні. У калгас уступілі 12 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Пераключаецца на ўдарныя тэмпы работы і калгас імя XII-годзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі. Першы выезд калгаснікаў у поле на ўборку ўраджаю ператварыўся ў магутную дэманстрацыю. Упераадзе рухаліся 11 уборачных машын, за імі 140 калгаснікаў з сярпамі і 70 калгаснікаў. За калгаснікамі ішлі дзесяткі індывідуальнікаў. Уся в. Кароткавічы, папрыклад, вышла ў поле наглядзець, як калгаснікі будуць калектыўна ўбіраць ураджай. Калгаснікі, ня гледзячы на нястачу 5.000 чалавека-дзён, па-баявому прыступілі да ўборкі. За 7 дзён работы ўбрана звыш 200 гэкт. азімых і 105 гэкт. сенажаці.

Большасьць калгасаў у раёне калектыўна ўбірае азімыя пасевы. 6 калгасаў раёну, якія арганізаваліся ў гэту вясну, пастанавілі індывідуальныя палоскі азімых убіраць калектыўна («Вольная Праца», «Чырвоная Беларусь», «Чырвоная Зорка», імя Войкава і г. д.).

Кулацкія элемэнты разгортваюць шалёную агітацыю супроць калгасаў. Кулакі і падкулачнікі ўсякімі спосабамі імкнуцца нацкаваць індывідуальнікаў супроць калгаснікаў, разваліць калгасы і сарваць уборачную кампанію. Асаблівую актыўнасьць кулакі праяўляюць у некаторых вёсках Майскага сельсавету.

У адказ на кулацкую агітацыю індывідуальнікі—беднякі і сераднякі, пад уплывам нюсьпехаў калгасаў, уступаюць у калектывы. За апошнія дні ў калгасы імя XII-годзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі, «Чырвоная Рудня», «Новае Жыцьцё», «Чырвоная Ніва», «На Варце», «Ясны Шлях», «Расьсьвет - Пераможца», «Дзяпроўск» і г. д. уступаюць усё новыя і новыя індывідуальныя бядняцка-серадняцкія гаспадаркі. У калгас «Расьсьвет - Пераможца» ўступае цэлая вёска Дзяніскавічы.

На гэтых перамогах нельга ні ў якім разе супакойвацца. Між тым, у раёне заўважаецца тэндэнцыя асобных работнікаў і арганізацый адпачыць на дасягнутых посьпехах. Райком партыі, напрыклад, значна паслабіў сваю ўвагу да ўборачнай кампаніі. РК КП(б)Б не аказвае калгасным парт'ячэйкам канкрэтнай кіраўнічай дапамогі.

Е. С.

Амэрыканскія фашыстыя расьперазаліся

Абураючыя паводзіны амэрыканскай камісіі ў часе допыту старшыні праўленьня Амторгу т. Багданава

НЬЮ-ЁРК, 22. Камісія амэрыканскага кангрэсу па расьсьледваньні дзейнасьці камуністых ПАЗШ на чале з Фішам дапрашвала ў якасьці сьведкі старшыню праўленьня Амторгу тав. Багданава.

Багданаву з самага пачатку забаранілі агаласіць заяву аб дзейнасьці Амторгу, даваць падрабязныя тлумачэньні. З прычыны таго, што Багданаў скарыстаўся даным законам правам адмовы ад дачы паказаньняў над прысягай, і абмежаваўся ўрачыстым абяцаньнем, камісія дабівалася, ці не належыць ён да якой-небудзь сэкты, якая забараняе клятву імем бога. Пытаньні фармуляваліся так, каб прымусіць т. Багданава прызнаць, што кампэртыя антыраліґійна і таму старэцца дабіцца ў Багданава прызнаньня, што ЦВК СССР — камуністычная арганізацыя, члены якой адны камуністыя.

Ня гледзячы на тлумачэньні т. Багданава, што Амторг—амэрыканская фірма, якая атрымлівае інструкцыі ад Наркамгандлю СССР, камісія ўсімі спосабамі старэцца давесьці, што Амторг падначалены Наркамгандлю, а, значыцца, савецкаму ўраду.

Камісія Фішa паставіла т. Багданаву шмат пытаньняў, якія ня маюць ніякіх адносін да дзейнасьці Амторгу. Так, напрыклад, Фіш пытае, ці праўда, што азбука камунізму, напісаная Бухарыным, патрабуе зьнішчэньня капіталізму і замены яго сацыялізмам? Фіш патрабуе, каб Багданаў назваў яму імя амэрыканскага чыноўніка, які даў яму візу на прыезд у Амэрыку, заявіўшы, што ўсякі чыноўнік, які дазваліў Багданову прыехаць у Амэрыку рабіў незаконна.

Тав. Багданаў не хацеў адказваць на палітычныя пытаньні, але адзін член камісіі стаў пагражаць Багданаву прыцягнуць яго да адказнасьці за зьнішчэньне камісіі.

Далей камісія заслухоўвала паказаньні т. старшыні праўленьня Амторгу, амэрыканскага грамадзяніна Озепа. У яго, напрыклад, пыталі, якую пасаду ён займае ў апараце ДПУ. Далей яго пыталі, якія існуюць адносіны паміж ім і лідэрам кампартыі ПАЗШ т. Фостэрам.

Допыт Озела адбываўся ў такой-жа варожай абстаноўцы, як і допыт Багданава. Ён падпадаў перакрыжаванаму допыту, пры чым часта яму заусім не давалі магчымасьці даваць тлумачэньні. (ТАСС).

* * *

НЬЮ-ЁРК, 23. Камісія Фішa паўторна дапрашвала т. Багданава ў якасьці сьведкі. Камісія Фішa дазволіла тав. Багданаву прадставіць камісіі заяву, у чым яму ўчора было адмоўлена. У заяве падаецца гісторыя разьвіцьця савецка-амэрыканскага гандлю.

Пасьля агалашэньня заявы т. Багданава аб дзейнасьці Амторгу камісія пачала задаваць пытаньні, патрабуючы дачы адпаскладовых адказаў. Сярод гэтых пытаньняў было пытаньне аб тым, ці зьяўляецца савецкі ўрад праціўнікам капіталістычнай сыстэмы. (ТАСС).

Абарона заваёў Кастрычніцкай рэвалюцыі

ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕ НАШАМУ САЦЫЯЛІСТЫЧНАМУ БУДАЎНІЦТВУ МІРНЫХ УМОЎ—

вось важнейшыя задачы замежнай палітыкі Савецкага Саюзу

Гутарка тав. Літвінава з замежнымі карэспандэнтамі

МАСКВА, 25. У гутарцы з замежнымі карэспандэнтамі тав. М. М. ЛІТВІНАЎ заявіў наступнае:

Пастанова ЦВК СССР аб назначэньні мяне ў якасьці народнага камісара ня можа ні ў якой меры азначаць якіх-небудзь зьмен у замежнай палітыцы Саюзу. Ня толькі таму, што я і раней на працягу 10-ці год працаваў у камісарыяце па замежных справах у цесным супрацоўніцтве са сваім папярэднікам тав. ЧЫЧЭРЫНЫМ, сумесна з ім актыўна ўдзельнічаў у распрацоўцы і правядзеньні ў жыцьцё замежна-палітычных праблем і на працягу апошніх двух год фактычна кіраваў ужо камісарыятам; а, галоўным чынам, таму, што зьмена кіраўнікоў ведамстваў у савецкай дзяржаве ня можа мець такога значэньня, як у капіталістычных краёх. У гэтых краёх зьмена членаў ураду і ў прыватнасьці кіраўнікоў замежнай палітыкі зьяўляецца ў большасьці выпадкаў рэзультатам барацьбы палітычных партый і клясавых інтарэсаў, прадстаўнікамі якіх гэтыя партыі зьяўляюцца, а часам прыстасаваньнем да зьмененай замежна - палітычнай кан'юнктуры і нават з замежным уплывам.

У краіне-ж дыктатуры пралетарыяту, дзе рабочыя і сяляне поўнасьцю і непадзельна ажыцьцяўляюць сваю ўладу, ЗАМЕЖНАЯ ПАЛІТЫКА ЦАЛКАМ ВЫЗНАЧАЕЦЦА ВОЛЯЙ РАБОЧА - СЯЛЯНСКІХ МАС, якая знаходзіць свой адбітак у пастановах савецкага ўраду.

У АСНОВУ ЗАМЕЖНАЙ ПАЛІТЫКІ САЮЗУ ПАКЛАДЗЕНЫ ПРЫНЦЫПЫ КАСТРЫЧНІКАЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ, І АБАРОНА ЗАВАЁЎ РЭВАЛЮЦЫІ АД ЗАМЕЖНАГА ЎЗЬДЗЕЙНІЧАНЬНЯ І ЎМЯШАЛЬНІЦТВА ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА АДНЭЙ З ЯЕ АСНОЎНЫХ ЗАДАЧ. Ня менш важнай задачай савецкай дыпляматыі зьяўляецца забесьпячэньне нашаму сацыялістычнаму будаўніцтву мірных умоў і свабоды ад замежных патрасеньняў. Чым больш значныя пляны нашага будаўніцтва, чым хутчэйшыя яго тэмпы, тым большая наша зацікаўленасьць у захаваньні міру. Да ажыцьцяўленьня гэтай задачы былі накіраваны нашы намаганьні да гэтага часу і будуць накіраваны яшчэ ў большай ступені ў далейшым. Нам прыходзіцца будаваць сацыялізм у адным краі, у акружэньні капіталістычных краін, якія займаюць 5/6 зямное кулі. Мы гэтага факту ня можам ігнараваць і не ігнаруем і таму імкнемся да адшуканьня і ажыцьцяўленьня спосабаў мірнага існаваньня абедзьвюх сацыяльных сыстэм.

Нам прыходзіцца і ў далейшым прыдзецца рабіць вялізарнейшыя намаганьні для барацьбы з агрэсыўнымі імкненьнямі пэўных капіталістычных груп, якія ідуць у бок стварэньня пастаянных непаразуменьняў і канфліктаў паміж абедзьвюма сыстэмамі, значыцца, і для ўмацаваньня і захаваньня міру паміж народамі. Існуючыя ўнутры самога капіталістычнага сьвету значныя нацыянальныя (палітычныя і эканамічныя) супярэчнасьці перашкаджаюць, аднак, устанаўленьню аднастайных адносін да Савецкага Саюзу і выпрацоўцы адзіных спосабаў барацьбы з ім. Так званыя мірныя дагаворы, якія завяршылі імпэрыялістычную вайну, паглыбілі супярэчнасьці, правёўшы глыбокую мяжу паміж пераможанымі, якая (мяжа) не паддаецца зьнішчэньню.

З прычыны нашага натуральнага спачуваньня краінам, у якіх усклядзеныя на іх цяжары кладуцца галоўным чынам на працоўных, а таксама таму, што дзяржавы, зацікаўленыя ва ўвекавечаньні вынікаў і несправядлівасьцяй, якія заключаюцца ў памянёных дагаворах, адначасова вядуць найбольш агрэсыўную і варожую палітыку і ў адносінах да нашага Саюзу, — стварыпася некаторая агульнасьць інтарэсаў Савецкага Саюзу з пацярпеўшымі ад вайны дзяржавамі. На грунце гэтай агульнасьці інтарэсаў у Савецкага Саюзу ўзьнікілі з некаторымі з гэтых дзяржаў зусім добрыя нармальныя і нават у некаторых выпадках прыяцельскія адносіны, якія мы і ў далейшым хацелі-б разьвіваць і ўмацоўваць.

Ня імкнучыся, аднак, да ўдзелу у групоўках адных дзяржаў супроць другіх, мы ў той-жа час шчыра будзем імкнуцца да ўстанаўленьня аднолькавых адносін з усімі дзяржавамі, якія гэтага пажадаюць. Мы ня скрываем, што пры ажыцьцяўленьні нашага ўзрастаючага эканамічнага будаўніцтва мы хацелі-б разьвіваць на далейшае пашырэньне эканамічных сувязяй з іншымі дзяржавамі. Гэта будаўніцтва чым далей, тым больш пашырае сфэру ўжываньня замежнай тэхнікі, замежнае прадукцыі замежнай прамысловасьці і нават некаторага сырцу. Але і тут мы сустракаемся з процілеглымі імкненьнямі асобных варожых капіталістычных груп, якія вядуць кампанію за зрыў эканамічных сувязяй з нашым Саюзам. Іх намаганьні накіраваны нібы галоўным чынам, супроць нашага экспарту, але на самай справе супроць усяго нашага замежнага таваравароту, бо скарачэньне нашага экспорту няўхільна прывяло-б і да адпаведнага скарачэньня нашага імпарту. Валютная сувязь паміж імпартам і экспартам настолькі ясна, што на ёй спыняцца ня варта. Дзяржавы, якія паддаюцца на гэту кампанію, што выходзіць ад зацікаўленых нязначных груп нашых канкурэнтаў па экспарце, і ставяць штучныя закондаўчыя або іншыя перашкоды ўвозу нашага сырцу і тавараў, не павінны наіўна думаць, што гэтыя мерапрыемствы вынікаюць скарачэньне або спыненьне нашага вывазу з гэтых краёў. Мы ўпэўнены, аднак, што ўсе гэтыя антысавецкія кампаніі прызначаны на поўную няўдачу, бо ў канчатковым рахунку яны павінны ўдарыць ня толькі па нашых інтарэсах, але яшчэ ў большай меры па інтарэсах тых краёў, якія да падобных кампаній далучыліся.

Цяпер, калі эканамічны крызіс настолькі паглыбіўся і пашырыўся, захапіўшы ўсе эўрапейскія і па-за эўрапейскія краі, выключэньне з сусьветнага таваравароту такое вялікае і эканамічна - мацнеючае адзіна вольнае ад гэтае дэпрэсіі дзяржавы, як наш Саюз, наўрад ці будзе прызнана мэтазгодным мерапрыемствам і адпавядаючым інтарэсам рэальнай палітыкі. Іменна, рэальна і правільна зразумелыя інтарэсы саміх капіталістычных краёў павінны будуць штурхаць іх у бок працягненьня і пашырэньня эканамічных сувязяй з Савецкім Саюзам. Мы самі добра сабе ўяўляем неабходнасьць эканамічных сувязяй і гандлёвых згод у данай гістарычнай абстаноўцы. Мы таму і раней не адмаўляліся і надалей ня маем намеру адмаўляцца ад кантакту і ад супольнага абмеркаваньня з прадстаўнікамі іншых краёў праблем, якія могуць закранаць інтарэсы нашага Саюзу. МЫ АХВОТНА БУДЗЕМ ПАДТРЫМЛІВАЦЬ ПАЧЫНАНЬНІ І ПРАПАНОВЫ, ЯКІЯ МАЮЦЬ НА МЭЦЕ ЗЬНІШЧЭНЬНЕ МАГЧЫМАСЬЦЯЙ ВАЕННЫХ СУТЫЧАК І ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕ УСЕАГУЛЬНАГА МІРУ. Мы будзем, аднак, выступаць у ролі бязьпітасных выкрываўцаў у тых выпадках, калі заўважым, што пад даўліцай маскай пацыфісцкай фразэалёгіі хаваюцца надзеі і інтарэсы, якія нічога супольнага з мірам і з сапраўднымі інтарэсамі народаў ня маюць. Мы абмяжуемся ролю назіральнікаў у тых выпадках, калі сапраўдныя мэты міжнародных акцый нам ня досыць ясныя і ня маюць патрэбы ва ўдакладненьні і выкрыцьці. Мы застанемся абсалютна чужымі і варожымі такім міжнародным акцыям, каторыя ў якой-небудзь меры могуць спрыяць прыгнятаньню адных народаў другімі ці падрыхтоўцы новых войн.

Мы асабліва ўважлівa будзем сачыць за палітыкай бліжэйшых суседніх краёў, дзе за апошні час зрабілася прыкметным узмацненьне агрэсыўных і шавіністычных рухаў, якія ствараюць вялікую пагрозу справе міру. Мы лічым парадкам АДНЭЙ З ВАЖНЕЙШЫХ ЗАДАЧ НАШАЙ ДЫПЛЯМАТЫІ ЎМАЦАВАНЬНЕ І РАЗЬВІЦЬЦЁ МІРНЫХ ДОБРАСУСЕДЗКІХ АДНОСІН З ГЭТЫМІ КРАЯМІ Ў ДУХУ НАШЫХ ПАЎТОРНЫХ МІРАЛЮБІВЫХ ПРАПАНОЎ І МАСКОЎСКАГА ПРАТАКОЛУ.

Наогул, мы будзем працягваць нашу старую, выпрабаваную замежную палітыку, усьведамляючы яе правільнасьць, яе адпаведнасьць інтарэсам усіх народаў, а таксама ўсьведамляючы ўзрастаючу моц Савецкага Саюзу.

У бой за сілас

НІЯКІХ АДСТУПЛЕНЬНЯЎ АД ПЛЯНАЎ

Мы ня можам вырашыць праблему жывёлагадоўлі без стварэньня адпаведнай кармавой базы. А становішча з кармамі ў сучасны момант нельга лічыць здавальняючым. Аб гэтым дакладваў XVI партзьезду т. Якаўлеў. І наша важнейшая задача на бліжэйшыя гады — пашырыць пасеўную плошчу пад кармавыя культуры, максымальна павялічыць кармавыя рэсурсы.

Зараз, калі ва ўсім Савецкім Саюзе і ў тым ліку ў Беларусі, пачаўся сіласны 10-ці днёвік, мы павінны паглядзець, што зроблена па выкананьні плянаў сіласаваньня. Тыя лічбавыя весткі, якія нам дае беларускае сіласнае бюро, малююць надзвычайна сумную карціну, якая мяжуецца са зрывам гэтага важнейшага мерапрыемства.

Аказваецца (калі верыць гэтым лічбам), што на 20-га ліпеня ў калгасах абсталявана сіласных установак (ямы, траншэі) на плошчы 8.973 куба-мэтраў, гэта складае 0,4 проц. выкананьня плянавага заданьня. Засіласавана зялёнай масы на тое-жа чысло ў калгасах 7/8 тон (пры пляне ў 400.000 тон), выкананьні пляну засеву сіласных культур (сланэчнік і кукуруза) вестак поўных няма, але з упэўненасьцю можна сказаць, што ад выкананьня пляну мы вельмі далёкі.

Такое становішча мы маем у калгасах. Што робіцца ў саўгасах па выкананьні сіласнага пляну — ніхто нічога на ведае. Белсельтрэст ніякіх вестак ня дай, з гэта, як нам паказала

Нам трэба высьвятліць — дзе-ж ляжаць прычыны такіх вынікаў па выкананьні сіласнага пляну.

Адна з прычын — адсутнасьць тэхнічных кадраў, знаёмых з сіласаваньнем.

Зараз справа з тэхнічнымі кадрамі некалькі выпраўляецца Праз раённыя двухтыднёвыя сіласныя курсы прапушчана звыш 2.000 чалавек. У Менску адбыліся пяцідзённыя курсы па сіласаваньні для раённых аграномаў і зоатэхнікаў. У Мазыры з удзелам прафэсуры с.-г. акадэміі адбылася інструкцыйная парада па сіласаваньні для аграномаў. Усе гэтыя курсы і нарады павінны крыху папоўніць прабел у кадрах па сіласаваньні.

ЛКСМБ у свой час адкрыў паход за сілас, некалькі разварушыў мясцовых работнікаў. Але гэты зрух ня быў замацаваны, паход за сілас ня быў даведзены да канца.

Цяпер у час сіласнага 10-ці днёвіка трэба прыцягнуць да кантролю за работай па сіласаваньні і для папулярызацыі гэтага мерапрыемства ўсіх работнікаў і спэцыялістых, мабілізаваных для правядзеньня ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі. Трэба мабілізаваць грамадзкую думку вакол сіласных мерапрыемстваў, прыцягнуўшы інтарэс самых шырокіх мас рабочых, калгаснікаў, беднякоў і сераднякоў да практыкі сіласаваньня.

Мы павінны цьвёрда памятаць, што вырашэньне пытаньня сіласаваньня і значыцца вырашэньне кармавой праблемы шчыльна зьвязана з ажыцьцяўленьнем задач партыі па падваеньні нашых мясных і малочных рэсурсаў.

Л. Н.

Тэрмометр для вымеру тэмпэратуры глебы

ЛЕНІНГРАД, 24. Прафэсар Савінаў вынайшаў надзвычайна адчувальны электрычны тэрмометр для вымеру тэмпэратуры глебы, у дакладнасьці да 2/10 проц. градуса. Прылада адкрывае новыя пэрспэктывы ў вывучэньні глебы. Дзякуючы гэтаму тэрмометру, шматмесячныя наглядзіны замяняюцца [illegible]

Фрунзаўскі РК КП(б)Б

оклікае

27-га ліпеня, а 6 гадзіне ўвечары ў клюбе Харчавікоў

шырокую беспартыйную РАБОЧУЮ КАНФЭРЭНЦЫЮ

З НАСТУПНЫМ ПАРАДКАМ ДНЯ:

Вынікі XVI-га зьезду ЎсеКП(б) і задачы рабочае клясы.

Дакладчык сакратар ЦК КП(б)Б тав. Васілевіч.

Менскі АК КП(б)Б паведамляе, што на 29 ліпеня а 10 гадз. раніцы склікаецца

аб'яднаны пленум АК і АКК КП(б)Б

па пытаньні аб ліквідацыі акруг і далейшых задачах партарганізацыі. (Дакл. т. СЛАВІНСКІ).

НАВУЧАЛЬНЫ ГОД ІДЗЕ

Партарганізацыя, прафсаюзы, камсамол! Дзе баявыя тэмпы падрыхтоўкі?

Навучальны год на парозе. Між тым падрыхтоўка ідзе чарапашным крокам. Недапушчальная павольнасьць многіх арганізацый ставіць пад пагрозу навучальны год. НКА, НКЗ, ВСНГБ марудзяць са спэцыялізацыяй школ. Пляны школьнага будаўніцтва павісьлі ў паветры. Белкаапсаюз зрывае грамадзкае харчаваньне студэнтаў. Злачынны хаос у забесьпячэньні школ падручнікамі. Бюракратычныя спрэчкі замест інтэрнатаў.

4.600 чалавек не хапае для ўкамплектаваньня ВНУ і тэхнікумаў БССР. Рабочая моладзь слаба ўцягваецца ва ўчобу. Сярод 500 заяў аб прыёме ў БДУ—ні аднэй ад рабочых. Гэта—рэзультат адрэннай растлумачальнай работы на прадпрыемствах. Рабочая моладзь ня ведае аб умовах паступленьня ў ВНУ. Камплектаваньне пэдтэхнікумаў напярэдадні правалу. Камсамол абавязаўся мабілізаваць у ВНУ і тэхнікумы 1.500 чалавек. Пакуль рэальных вынікаў мабілізацыя не дала.

З бальшавіцкай упартасьцю змагацца за пяцігодку кадраў

Ліквідаваць прарывы ў падрыхтоўцы да навучальнага году

Пасьпяховае прасоўваньне наперад у вырашэньні праблемы кадраў зьяўляецца неабходнай умовай выкананьня пяцігодкі нашае народнае гаспадаркі. Вось чаму партыя з усёй вострасьцю паставіла задачу падрыхтоўкі пралетарскіх кадраў.

Практычнае ажыцьцяўленьне гэтай задачы разгортваецца па лініі самай шырокай падрыхтоўкі кваліфікаваных рабочых праз паскоранае разьвіцьцё сеткі школ ФЗВ, прафшкол, шляхам укараненьня палітэхнізацыі ў школы 2-й ступені, шляхам паскоранай падрыхтоўкі сярэдняга тэхнічнага пэрсаналу.

Рэарганізацыя вышэйшай школы, актывізацыя мэтадаў выкладаньня, устанаўленьне арганічнай сувязі тэарэтычнага навучаньня з бесьперапыннай вытворчай практыкай, правядзеньне адзіначальня, непасрэдная сувязь і кіраўніцтва справай падрыхтоўкі кадраў гаспадарчымі арганізацыямі, — вось арсэнал нашых дасягненьняў у барацьбе за кадры чырвоных спэцыялістых.

Наперакор праротвам правых, атакаваўшых лінію партыі па пытаньнях аб кадрах, якая зводзіцца да недаацэнкі змаганьня за кадры — МЫ ЗНАЧНА ПЕРАВЫКАНАЛІ ПЕРШАПАЧАТКОВЫЯ НАМЯЧЭНЬНІ ПЯЦІГАДОВАГА ПЛЯНУ Ў ПАДРЫХТОЎЦЫ КАДРАЎ.

Згодна новай пяцігодкі ў бліжэйшыя тры гады будуць прыняты ў вышэйшыя навучальныя ўстановы 9.800 чалавек, замест 4.200 паводле старой пяцігодкі і ў тэхнікумы 22.500 чалавек замест 3.000.

У ГЭТЫМ ГОДЗЕ Ў БССР АДКРЫВАЕЦЦА ПЕРШАЯ ВТНУ, 7 ІНДУСТРЫЯЛЬНЫХ, 7 СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧЫХ І 2 САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫХ ТЭХНІКУМЫ.

Гэтыя дасягненьні на культурным фронце зьяўляюцца выразам разьвіцьця усяго нашага сацыялістычнага наступленьня.

Адсюль вынікае выключная вострасьць і неабходнасьць далейшага ўзмацненьня змаганьня за кадры, неабходнасьць рашучага змаганьня з усякага роду апартыністычнымі скажэньнямі, апартыністычнай недаацэнкай важнасьці справы падрыхтоўкі кадраў.

Надыходзячы новы навучальны год павінен яшчэ больш завастрыць увагу партыйных, камсамольскіх, прафэсыянальных арганізацый, ўсёй нашай савецкай грамадзкасьці наваколь пытаньня падрыхтоўкі патрэбных нам кадраў.

НАРАДА, праведзеная рэдакцыяй газэты «Зьвязда» па пытаньнях аб падрыхтоўцы да навучальнага году ВЫЯВІЛА БУЙНЕЙШЫЯ ПРАРЫВЫ на гэтым вучастку, ЗА ЛІКВІДАЦЫЮ ЯКІХ МЫ ПАВІННЫ УЗЯЦЦА ЗАРАЗ-ЖА, НЕ АДКЛАДАЮЧЫ НІ АДНАГО ДНЯ.

Нарада выявіла недапушчальна МАРУДНЫЯ ТЭМПЫ падрыхтоўкі да навучальнага году, НАДЗВЫЧАЙ СЛАБУЮ МАБІЛІЗАЦЫЮ ТЫХ СІЛ І СРОДКАЎ, без якіх мы можам мець ПЭЎНЫЯ ЗРЫЎ у выкананьні плянаў гэтага году. Аб недапушчальна надбайных адносінах да гэтага пытаньня выразьнейшым чынам сьведчыць той факт, што на нараду не зьявіўся нават ніводны прадстаўнік ЦСПСБ, камсамолу (якія былі запрошаны на нараду).

Нарада выявіла асноўную небясьпеку зрыву навучальнага году — НЕДАКАМПЛЕКТАВАНЬНЕ НАШЫХ ВНУ (на 600 чалавек) і тэхнікумаў (на 4.000 чалавек), ПАГРОЗУ Ў ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНІ гэтых навучальных устаноў ПАТРЭБНЫМ НАМ САЦЫЯЛЬНЫМ СКЛАДАМ.

Так, З 500 ЗАЯЎ, ПАДАНЫХ У БДУ, МЫ НЯ МАЕМ ЗАРАЗ АМАЛЬ НІ АДНАГО РАБОЧАГА. Асноўнай прычынай такога зьявішча зьяўляецца адсутнасьць усякай растлумачальнай работы сярод рабочых па папулярызацыі нашых навучальных устаноў, і ў прыватнасьці БДУ, аб чым яскрава гаворыць факт, выяўлены брыгадай БДУ, якая, аб'ехаўшы буйныя прадпрыемствы і калгасы з мэтай вярбоўкі рабочых і калгасьнікаў у ВНУ — выявіла: НА БУЙНЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАХ РАБОЧЫЯ НАВАТ НЯ ВЕДАЮЦЬ АБ БДУ, НЯ ВЕДАЮЦЬ ЯКІЯ ТАМ ЁСЬЦЬ ФАКУЛЬТЭТЫ.

Адна з асноўных крыніц, дзе нашы ВНУ чарпаюць кадры адпаведнага сацыяльнага складу для набору — курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ па пастаноўцы сваёй справы (у чым бязумоўна трэба вінаваціць НКА) не далі ўсяго таго, што яны маглі даць.

Так, з 500 заяў паданых у БДУ, мы ня маем ні аднэй заявы ад скончыўшых курсы, у той час, калі на гэтыя курсы і цяпер спадзяюцца шмат якія навучальныя ўстановы. КУРСЫ АРГАНІЗОЎВАЛІСЯ БЕЗ УСТАНОЎКІ, ІХ АРГАНІЗОЎВАЎ ХТО ХАЦЕЎ, ІМІ НЕ КІРАВАЛІ, ЯК НАЛЕЖЫЦЬ.

Нарада выказалася ЗА ПЛЯНАВАСЬЦЬ У РАБОЦЕ ГЭТЫХ КУРСАЎ, ЗА НЕАБХОДНАСЬЦЬ ЗАМАЦАВАНЬНЯ ГЭТЫХ КУРСАЎ ЗА ФАКУЛЬТЭТАМІ.

У асноўным нашыя ВТНУ забясьпечаны кантынгентам адпаведнага сацыяльнага складу. Цяга ў ВТНУ з боку рабочых вялікая. Але і тут НЕЛЬГА СПАДЗЯВАЦЦА НА САМАЦЁК. І тут трэба правесьці вялікую работу.

АСАБЛІВУЮ НЕБЯСЬПЕКУ Ў ПЫТАНЬНІ КАМПЛЕКТАВАНЬНЯ МЫ МАЕМ ПА ЛІНІІ ПЭДАГАГІЧНЫХ ВНУ І ТЭХНІКУМАЎ. Так, напрыклад, па лініі падкурсаў дагэтуль мы ня маем НІ АДНЭЙ ЗАЯВЫ. Мы маем такое зьявішча, калі рабочыя ня хочуць ісьці ў пэдагагічныя навучальныя ўстановы, з гэтымі настроямі не змагаюцца, як сьлед, не праводзяць растлумачальную работу сярод рабочых у гэтым напрамку.

Між тым, пытаньне падрыхтоўкі надраў для кадраў — самае баявое, гэтыя кадры асабліва павінны быць падазаны, мець клясавае загартаваньне. Недахват гэтых кадраў надзвычай вялікі. І тут трэба правесьці вялікую растлумачальную работу нашым партыйным, камсамольскім і прафсаюзным арганізацыям. Трэба камсамолу, які абяцаў па мабілізацыі ДАЦЬ 1.000 У ПЭДТЭХНІКУМЫ і 500 ў ВНУ (а пакуль рэальных вынікаў няма), ПРАВЕСЬЦІ ПАЎДАРНАМУ ГЭТАЕ БАЯВОЕ ЗАДАНЬНЕ.

Нарада выявіла нядбайныя бюракратычныя адносіны з боку некаторых арганізацый (Наркамасьветы, ВСНГ, НКЗ) да пытаньня вызначэньня спэцыялізацыі навучальных устаноў, (увядзеньня палітэхнізацыі ў школах (гл. выступленьні тт. Ратнэра, Цмыга, Анодзіна і інш.)

Нарада выявіла, што і дагэтуль навучальныя ўстановы не забясьпечаны навучальнымі праграмамі, падручнікамі (друкуецца зараз толькі 9 падручнікаў) нядбайнейшыя адносіны да нападжваньня харчаваньня студэнтаў, ПАГРАЖАЮЧАЕ СТАНОВІШЧА З БУДАЎНІЦТВАМ.

Становішча з будаўніцтвам школьных памяшканьняў, і асабліва памяшканьняў пад інтэрнаты, ставіць у шмат якіх мясцох пад пагрозу зрыву заняткі. У гэтым пытаньні мы маем пэўную цяганіну, як з боку Наркамасьветы, так з боку будаўнічых арганізацый.

Трэба зараз жа, НЕ АДКЛАДАЮЧЫ НІ НА АДЗІН ДЗЕНЬ ПА-ЎДАРНАМУ рыхтавацца да навучальнага году, ВЫНЕСЬЦІ ГЭТУЮ РАБОТУ З ГАБІНЭТАЎ УСТАНОЎ У МАСЫ. Трэба партыйным і камсамольскім арганізацыям мабілізаваць усю грамадзкасьць на правядзеньне гэтай ударнай работы, трэба адпаведным арганізацыям зараз ліквідаваць тыя прарывы, якія залежаць ад гэтых арганізацый. Трэба самым РАШУЧЫМ ЧЫНАМ ЗМАГАЦЦА З АПАРТУНІСТЫЧНАЙ НЕДААЦЭНКАЙ ПАДРЫХТОЎКІ КАДРАЎ, да новага навучальнага году.

Патрэбны рашучыя заходы па ліквідацыі прарыву ў будаўніцтве

Пабудова 13 баракаў пад інтэрнаты студэнтаў адносна да першачарговых работ, бо невыкананьне ў тэрмін гэтай пабудовы ставіць пад пагрозу зрыву падрыхтоўку кадраў у БДУ ў гэтым годзе.

Ня гледзячы на гэта, Саюзпес вельмі марудна выконвае нарады будаўнічага сэктару Дзяржпляну на водпуск лясных матар'ялаў, якіх для мэты патрэбна ў колькасьці 4.500 куб. м. і якія атрыманы ад Дзяржпляну 6-VI і ня выконваліся Саюзпесам да 1-га ліпеня.

У сучасны момант лесаматар'яды паступаюць на пабудову зусім нездавальняючым тэмпам і ў малым ліку і не даюць разгарнуць работу патрэбным тэмпам. Апрача гэтага будаўнічым сэктарам Дзяржпляну і дагэтуль ня высьветлена пытаньне наконт водпуску кровельнага толю для пакрыцьця цэху, з прычыны чаго ёсьць бязумоўная пагроза таму, што пабудаваныя інтэрнаты будуць скончаны сялчасова.

Для скончаньня галоўнага аўдыторнага корпусу БДУ не хапае 10 вагонаў цэмэнту і 500 куб. м. сасновых сталярных дошак таўшчынёю 2½ см., без чаго нельга скончыць астатнюю работу і здаць нельга скончыць астатнюю работу і здаць прарываў у паказаным вышэй будаўніцтве патрэбны наступныя рашучыя захады:

1. Абавязаць Дзяржплян, НКГандаль і Саюзпес з падпарадкаванымі ім органамі забесьпячэньня зараз-жа не пазьней 5-га жніўня г. г. не на паперы, а на справе адпусьціць для пабудовы бэракаў патрэбную колькасьць песаматар'ялу, згодна капіндарных нарадаў, цьвікоў, а таксама зараз-жа прыняць тэрміновыя захады да водпуску кровельнага толю.

2. Абавязаць Менбуд, які выконвае гэту работу, прыняць меры для забесьпячэньня работы патрэбнай колькасьцю рабочай сілы і падвод для дастаўкі матар'ялу на месца пабудовы з тым разьлікам, каб першыя 6 баракаў былі абавязкова скончаны да 1-IX г. г. і апошнія 7 — да 1-X г. г.

3. Абавязаць Белдзяржбуд (Менскае аддзяленьне) выпучыць з маючыхся ў яго фондаў патрэбную колькасьць сталярнага лесу для скончэньня сталярных работ, асабліва дзьвярэй і вокан, якіх да гэтага часу амаль што няма.

4. Для скончэньня астатніх работ па ўсім БДУ трэба абавязкова выпучыць 10 вагонаў цэмэнту за лік тых пабудоў, якія ў гэтым годзе скончаны ня будуць.

ЛАЎРОЎ.

Сад „ПРАФІНТЭРН"

1-га жніўня а 8 з палов. гада. вечара ЦСПСБ праводзіць

МАСАВЫ МІТЫНГ

рабочых і ўсіх членаў прафсаюзаў

ПРЫСЬВЕЧАНЫ

МІЖНАРОДНАМУ ЧЫРВОНАМУ ДНЮ

Пасьля мітынгу 2 вялікіх канцэрты на адчыненай эстрадзе і ў летнім тэатры.

Уваход у сад на прафсаюзных членскіх і камсамольскіх білетах.

У летні тэатр білеты будуць разасланы па саюзах.

ЦСПСБ.

Спаткаць навучальны год падрыхтаванымі!

(На нарадзе пры рэдакцыі „Зьвязды")

Гэтымі днямі рэдакцыя газ. «Зьвязды» склікала шырокую нараду па пытаньні падрыхтоўкі да новага навучальнага году.

На нарадзе прысутнічала каля 40 чалавек прадстаўнікоў ад розных устаноў (НКА, ВСНГ, НКЗ), рэктары БДУ, ВТНУ, Сельска-гаспадарчай Акадэміі, дэканаты факультэтаў, прадстаўнікі партарганізацый, прафарганізацый навучальных устаноў, студэнцтва.

Пасьля кароткай інфармацыі прадстаўніка рэдакцыі газ. «Зьвязда» выступілі з справаздачай па падрыхтоўцы да новага навучальнага году: прадстаўнік НКА, ВСНГ, НКЗ, рэктары ВНУ і ВТНУ. Пасьля іх слова разгарнуліся спрэчкі.

Тав. Чарнабародаў (НКА)

Камплектаваньне пэдагагічных ВНУ і тэхнікумаў зрываецца

Калі ў мінулым годзе мы прынялі ва ўсе навучальныя ўстановы ўсяго каля 12.000, дык у гэтым годзе—у ВНУ мы прымаем 3.300 чалавек, у тэхнікумы 20.000. У гэтым годзе мы прымаем у ВНУ у 2 з паловаю разы больш, у тэхнікумы ў два разы больш.

Для укамплектаваньня ВНУ нам не хапае 600 чалавек. Але надзвычайна пагражаючае становішча мы маем з камплектаваньнем у пэдтэхнікумы і пэдкурсы. Тут нам не хапае 4.000 чалавек.

Мы маем пагрозу педабору на пэдагагічных ВНУ і асабліва пэдтэхнікумах. У пэдтэхнікумах мы ня маем зараз ні адной заявы.

Мы маем зрыў у пытаньнях укамплектаваньня пэдагагічных ВНУ і пэдкурсаў патрэбным сацыяльным складам. Ня гледзячы на шматлікія пастановы аб прыраўнаньні стыпэндыі пэдагагічных тэхнікумаў да індустрыяльных, пытаньне аб ураўненьні стыпэндый канчаткова ня вырашана. Таксама правальваецца пытаньне аб умацаваньні пэлкурсаў рабочым ядром. На мясцох нічога ня робіцца ў гэтых адносінах, не праводзіцца ніякай растлумачальнай работы на пытаньнях укамплектаваньня рабочым ядром нашых пэдагагічных устаноў.

Калі камсамол абвясьціў мабілізацыю 1.000 у пэдтэхнікумы і 500 у ВНУ, дык як выконваецца гэта разьмеркаваньне невядома і дагэтуль. Трэба было арганізаваць падрыхтоўчыя курсы ў пэдтэхнікумы на 4.000 і ў ВНУ на 700 чалавек. Але гэтыя курсы не далі вынікаў. У БДУ падана ўжо 500 заяў, але сярод іх НЯМА РАБОЧЫХ.

Зрываецца забесьпячэньне студэнтаў інтэрнатамі. Патрэбны інтэрнаты на 10.000 чалавек. Не хапае — на 6.000 чалавек. А будаўніцтва інтэрнатаў пад пагрозай зрыву.

Наркамасьветы дабіўся дэкрэту Саўнаркому аб будаўніцтве, дэкрэту аб рабоце ЦРК у галіне харчаваньня студэнтаў.

Тав. Куніца (ВТНУ)

Галоўнае—своячасовы набор у ВТНУ

Увосень мы павінны мець набор у нашы палітэхнічныя ВТНУ ў 220 чалавек. Зараз мы маем у індывідуальным парадку каля 300 заяў. Забраніраваны месцы ў ВТНУ — на 50 чалавек па лініі партыцясячы, на 200 чалавек па лініі курсаў, 115 чалавек па лініі ПУР'у.

Але покуль што гэта лічбы, — разьвёрстка.

Курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ і ВТНУ існуюць, але яны ўкамплектоўваліся адміністрацыйна, увага грамадзкасьці вакол гэтых курсаў ня была мабілізавана, у выніку чаго мы маем распад курсаў па падрыхтоўцы ў ВНУ. На паперы лік скончыўшых курсы ёсьць, а на справе іх няма.

Асноўная труднасьць для нас — гэта пытаньне кадраў для кадраў і памяшканьне для іх. Заявы інжынэраў ёсьць, але няма кватэр. І тут ставіцца рубам пытаньне: ня будзе кватэр для прафэсараў, асыстэнтаў, навуковых работнікаў, якія прыяжджаюць да нас з іншых гарадоў — вучоба зрываецца.

Па дакладу ВТНУ яшчэ ў красавіку месяцы была вынесена пастанова СНК аб забесьпячэньні навуковых работнікаў кватэрамі. Але і дагэтуль ні гарсавет, ні акрвыканком гэтай пастановы ня выканалі. А ВСНГ і Наркамасьветы прамарглі пытаньне аб кватэрах навуковых працаўнікоў.

Умовы прыёму рабочых у тэхнічныя навучальныя ўстановы — агіднейшыя. Патрэбны дзесяткі справак, якія цяжка дастаць рабочаму, працуючаму на вытворчасьці. Нам трэба на 75 проц. арабочыць ВТНУ, а гэта цяганіна зьяўляецца тормазам. Неабходна, каб па лініі ВСНГ была дадзена дырэктыва ў тым напрамку, каб рабочы прымаўся ў ВТНУ з аднэй анкетай.

Тав. Пінчук (Горацкая с.-г. акадэмія)

Для 250 студэнтаў не хапае інтэрнатаў

Мы ў гэтым годзе павінны прыняць у акадэмію каля 500 чалавек, а ў нас і зараз не хапае інтэрнатаў для 250 чалавек. Новы корпус для 250 чал., які будуецца зараз, ня будзе гатовы да 1 кастрычніка, як гэта прадугледжвалася плянам. Для навучальнага корпусу толькі закладзены фундамент.

У справе забесьпячэньня прыёму належнага сацыяльнага складу мы спадзяемся на Наркамасьветы, які абяцаў даць гэты кантынгент па лініі курсаў.

Мы маем надзвычай дрэнная матар'яльнае становішча з зоатэхнічным інстытутам, які адчуваецца ў Горках. Наркамфін не дае асыгнаваньня на гэты інстытут, спасылаючыся на тое, што ён арганізоўваецца ў Горках і, быццамбы не патрабуе ніякіх затрат. Між тым, з-за адсутнасьці сродкаў вучоба ў зоатэхнічным інстытуце можа бязумоўна сарвацца.

Тав. Кучараў (выканком БДУ)

Арганізоўваць курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ пры факультэтах

Толькі 4-га ліпеня падпісаў Наркамасьветы з Менбудам дагавор на пабудову 13-ці баракаў пад інтэрнаты студэнтаў. Мне, як брыгадзіру на агляднае будаўніцтва, прышлося сустрэцца з агіднейшымі зьявамі цяганіны, бюракратызму, нядбайнасьці ў адносінах гэтага будаўніцтва. Паўтара месяца зусім дарэмна разьяжджаў інжынэр Наркамасьветы ў пошуках праектаў для баракаў. Урэшце прывёз гэтыя праекты з Харкава, але аказалася, што менскія праекты былі лепшымі і іх пакінулі. Толькі з 1-га чэрвеня Наркамасьветы стаў клапаціцца аб лесаматар'яле. Нават з камгасам ня ўмовіліся як сьлед аб пляцы для баракаў, у выніку чаго [illegible] аб гэтым.

Цікавы вопыт Гомельшчыны

Шматтыражкі-аднаднеўкі, выпушчаныя райпарткомам Гомельшчыны. Шматтыражкі спэцыяльна прысьвечаны пытаньням партыйнай вучобы.

Тав. Дружапоўскі (ВСНГ)

Хто павінен арганізоўваць Гомельскі аўтатрактарны тэхнікум?

У гэтым годзе ў фабзавучы і прафшколы будзе прынята 1.875 чалавек. Справа з камплектаваньнем у ФЗВ і прафшколы, а таксама справа з пэдагагічнымі кадрамі па агульна-адукацыйных прадметах у гэтых школах абстаіць здавальняюча.

Дрэнная справа з пэдагагічным пэрсаналам па спэцыяльных прадметах. Адсюль зрывы заняткаў.

Ня лепш абстаіць справа з забесьпячэньнем інтэрнатамі прафшкол і ФЗВ. Так, у ФЗВ краўцоў з-за адсутнасьці памяшканьня зрываецца прыём у гэтым годзе. СНК ухваліў пабудаваць зараз-жа інтэрнаты для ФЗВ краўцоў, але і дагэтуль пастанова ня выконваецца.

З Гомельскім аўтатрактарным тэхнікумам — быццамбы. Хто павінен арганізоўваць гэты тэхнікум, ці Наркамзем, ці ВСНГ — і зараз невядома.

Тав. Такаронак (НКЗ)

У с.-г. тэхнікумы набор павялічыўся ў тры разы, а заявы падаюцца адзінкамі

Мы даручылі прыём у с.-г. тэхнікумы і курсы, якія былі раней ў распараджэньні Наркамасьветы — раённым земельным аддзелам.

Дзякуючы таму, што мы і дагэтуль ня прынялі ад НКА актаў па справах гэтых устаноў, мы ня ведаем іх дэталёвага становішча.

Паводле вестак з тэхнікумаў, мы ведаем, што заяў у тэхнікумы падана надзвычай мала, што гэта пагражае пасьпяховаму камплектаваньню с.-г. устаноў.

Пагражаючае становішча з пэдагагічнымі кадрамі, па агульна-адукацыйных прадметах. Калі раней іх разьмяркоўвалі па акругах акрінспэктарыяты, дык зараз у сувязі з перадачай с.-г. навучальных устаноў НКЗ — ніхто гэтай справай не займаецца.

Навучальныя пляны ў старых тэхнікумах зацьверджаны. У новых-жа, напрыклад у Полацкім лясным тэхнікуме і Мар'іна-Горскім с.-г. тэхнікуме — праграмы ня складзены.

Тав. Каранеўскі (рэктар БДУ)

Усе сілы на ліквідацыю прарываў у будаўніцтве. Мабілізуем грамадзкасьць навакол баявых задач па ўкамплектаваньні ВНУ рабочымі, калгасьнікамі

Будаўніцтва корпусоў універсытэцкага гарадка, якія, згодна пляну павінны быць скончаны 1-га верасьня — скончаны ня будуць. Галоўны корпус, калі будзе ўвесь патрэбны матар'ял, пабудуецца не раней сярэдзіны кастрычніка.

З інтэрнатамі студэнтаў такое становішча: усе старыя будынкі, якія мы мелі пад інтэрнатамі — Наркамасьветы забірае пад школы, спасылаючыся на новыя 13 баракаў, якія павінны будавацца. Але замест баракаў мы маем зараз 500 бярвеньняў і некалькі рабочых.

У агуле-ж з будаўніцтвам мы можам апынуцца ў такім становішчы, што ня толькі павялічыцца плошча пад інтэрнатамі, але і зьменшыцца на 200-250 чалавек, калі своячасова мы гэты прарыў не ліквідуем. А гэты прарыў мы ліквідаваць можам, калі адпаведныя арганізацыі па-ўдарнаму возьмуцца за выкананьне пляну будаўніцтва.

Ніводнага будынку мы ня маем для навуковых работнікаў, што ставіць пад пагрозай пытаньне камплектаваньня ВНУ належнымі кадрамі прафэсуры, асыстэнтаў, якіх мы ў большай частцы атрымоўваем з Масквы і іншых гарадоў.

У адносінах вярбоўкі рабочых у ВНУ мы маем добры пачын БДУ — гэта [illegible] сылка брыгад на прадпрыемствы, у калгасы, з мэтай папулярызацыі БДУ і вярбоўкі рабочых калгасьнікаў у навучальныя ўстановы. Брыгады ахапілі 3 акругі, 84 пункты, рабілі даклады на прадпрыемствах, у калгасах, на партыйных і прафэсыянальных сходах. Брыгады выявілі такое зьявішча, што на буйных прадпрыемствах ніхто ня ведаў пра БДУ, аб тым, якія там ёсьць факультэты, якія правілы прыёму і г. д.

У выніку работы брыгад мы на сёньня маем 500 заяў, пераважную большасьць якіх мы атрымалі дзякуючы рабоце брыгад.

Нам (БДУ) нічога не далі курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ, якімі кіруе Наркамасьветы. З 500 заяў няма ніводнай заявы ад тых, якія скончылі гэтыя курсы. Пагражаючае становішча з укамплектаваньнем мы маем на пэдфаку, мэдфаку. Ніхто, напрыклад, ня дбае, каб былі падабраны адпаведныя кадры для яўрэйскага аддзяленьня пэдфаку. Летась па гэтым аддзяленьні недабор быў на 60 проц., мы не гарантаваны, што і ў гэтым годзе будзе ня лепш.

Нашы партыйныя, камсамольскія і прафэсыянальныя арганізацыі на мясцох амаль нічога ня робяць, каб правесьці растлумачальна-масавую работу па вярбоўцы ў ВНУ. Такая зьява, як павялічэньне стыпэндыі ў гэтым годзе на 100 проц., нікому невядома, нават друк маўчыць аб гэтым.

Нашы прапановы

1. Культпропам партыйных і камсамольскіх камітэтаў ва ўдарным парадку правесьці шырокую работу ПА МАБІЛІЗАЦЫІ ЎСЁЙ САВЕЦКАЙ ГРАМАДЗКАСЬЦІ НАЎКОЛА ПАДРЫХТОЎКІ ДА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДУ, асабліва па пытаньні ВЯРБОЎКІ РАБОЧЫХ У ВНУ І ТЭХНІКУМЫ.

Арганізаваць ударныя брыгады з рабочых, камсамольцаў, студэнцтва па папулярызацыі нашых навучальных устаноў, па вярбоўцы рабочых, на гасьнікаў у гэтыя ўстановы, пасылаючы гэтыя брыгады на буйныя прадпрыемствы, у саўгасы і калгасы.

2. Максымальна выкарыстаць аспабаняемыя ў сувязі з ліквідацыяй акругаў ад устаноў памяшканьні пад навучальныя ўстановы і інтэрнаты студэнтаў.

Белдзяржбуду неадкладна выканаць дэкрэт Саўнаркому аб своячасовым пабудове патрэбных памяшканьняў для навучальных устаноў. Дзяржпляну, Наркамгандлю і Саюзлесу ў працягу бліжэйшага тыдню адпусьціць для пабудовы баракаў пад інтэрнаты студэнтаў патрэбную колькасьць песаматар'ялу, згодна дагавору з НКА.

Менбуд павінен прыняць меры для забесьпячэньня цесьлярамі пабудоў баракаў-інтэрнатаў. Наркампрацы павінен даць для гэтай пабудовы цесьляроў з іншых пабудоў.

Гарсаветам, Акрвыканкомам неадкладна выканаць пастанову СНК аб забесьпячэньні навуковых работнікаў, прафэсароў, асыстэнтаў кватэрамі.

3. Белкаапсаюзу прыняць рашучыя захады да забесьпячэньня студэнтам харчаваньня адкрыўшы для студэнтаў сталоўкі.

4. Неадкладна перадаць навучальныя ўстановы ў распараджэньне тых органаў, якім гэтая перадача належыць. Канкрэтна: с.-г. тэхнікумы і курсы — с.-г. акадэмія і інш. павінны быць не на паперы, а на справе перададзены зараз-жа НКЗ.

5. Прыцягнуць да судовай адказнасьці ўсіх тых, хто вінаваты ў несвоячасовым выпуску падручнікаў для навучальных устаноў. НКА, БДВ прыняць самыя рашучыя захады да своячасовым выпуску максымуму патрэбных падручнікаў.

6. НКА неабходна вырашыць пытаньне па лініі курсаў падрыхтоўкі ў БДУ —разьмеркаваньне курсантаў, якія займаюцца на курсах, па пэўных факультэтах, правёўшы ў гэтых адносінах масавую растлумачальную работу.

7. Ва ўдарным парадку партыйным арганізацыям трэба праверыць выкананьне дырэктывы партыі з боку гаспадарчых арганізацый па падрыхтоўцы да навучальнага году.

8. Камсамолу выканаць баявое заданьне па мабілізацыі «тысячы» у падтэхнікумы і «500» у ВНУ. Камсамольскім камітэтам неабходна зараз-жа правесьці дырэктывы ЛКСМ у адносінах выкананьня арганізацыямі камсамолу гэтай мабілізацыі.

Тав. Анодзін (Менскі палітэхнікум)

Каго-ж рыхтуе менскі палітэхнікум?

У гэтым годзе мы будзем мець 600—700 чалавек прыёму. Заяў мы маем да 2.000. З іх больш тысячы ад дзяцей рабочых. Між тым, мы ня маем патрэбнай плошчы пад інтэрнатамі, пад памяшканьнямі для вучобы.

І цяпер няма выразнасьці ва ўстаноўках—колькі і якія рабочыя патрэбны, якой спэцыяльнасьці рабочых выпускае наш тэхнікум. ВСНГ кажа, што патрэбны тэхналёгічны ўхіл, цяпер раздумаі і выдумляюць штосьці іншае.

З ліквідацыяй акруг уся плошча, якая аслабяняецца, павінна быць перададзена для падрыхтоўкі кадраў.

Тав. Гурвіч (рабфак)

Растлумачыць рабочым значэньне і пэдвузоў

Мы сёньня маем такі малюнак падрыхтоўкі да навучальнага году: Наркамасьветы пяе псальмы аб дэкрэтах, Наркамзем «нічога ня ведае», у ВСНГ — «усё добра». З такімі адносінамі да падрыхтоўкі кадраў, да падрыхтоўкі да новага навучальнага году трэба рашучым чынам змагацца.

Наркамасьветы павінен быў разьмеркаваць камандыроўкі па акругах да 1-га мая, а пачалі разьмяркоўваць толькі нядаўна. Па Менску і цяпер камандыроўкі не разьмеркаваны.

На курсах БДУ лічыцца 200 чалавек, а фактычна ёсьць 63. У нас заўважаецца сярод рабочых нежаданьне ісьці на пэдфак. Гэтыя адносіны яшчэ ня зжыты, наконт гэтага трэба правесьці нашым прафсаюзам, камсамольскім і партыйным арганізацыям патрэбную растлумачальную работу.

Тав. Ратнэр (Бюро парткалектыву БДУ)

Аб 10 паездках і 10 праектах. Чахарда са спэцыяльнасьцямі працягваецца

Надзвычай важнае пытаньне — пытаньне аб спэцыяльнасьцях. Для палітэхнічнай ВНУ Саўнарком БССР вызначыў 12 спэцыяльнасьцяй. А калі наш хэмфак БДУ, як ВТНУ, перайшоў у распараджэньне Галоўпрамкадраў СССР, спэцыяльнасьці, прадугледжаныя СНК, скасавалі: «скураной спэцыяльнасьці ня будзе—не даюць скуры»; «папяровай спэцыяльнасьці таксама ня будзе—няма паперы».

А ВСНГ нічога не рабіў у гэтых адносінах. Год мы праіснавалі і зараз ня ведаем, якія спэцыяльнасьці на хэмфаку будуць.

Адбылося 10 нарад і пры гэтым выносілася 10 праектаў. Адбылося 10 паездак і выносілася 10 праектаў. Выраішылі, урэшце, што будуць наступныя спэцыяльнасьці: кэрамічная, брадзільная, тарфяная, папяровая-цэлюлёзная і інш.

Саюзпапера апратэставала апошнюю спэцыяльнасьць. А як паехалі ў Маскву, дык нам вызначылі яшчэ адну спэцыяльнасьць па першапачатковай апрацоўцы лубяных валокан.

Чэхарда са спэцыяльнасьцямі працягваецца. Да гэтага пытаньня—казённыя адносіны. І галоўная тут віна ВСНГ.

Пытаньне аб спэцыяльнасьцях было вырашана шляхам апытаньня за 5 хвілін. Так што і вызначаныя зараз спэцыяльнасьці прыводзяць да сумненьня, ці правільна яны вызначаны.

Меркавалася вытворчае навучаньне пачаць з 1-га верасьня. Але і зараз няма варштатаў. Ня вырашана пытаньне аб аплаце.

У справе камплектаваньня ВТНУ спэцыяльным складам — мы маем поўную пагрозу. Пакуль што заявы ідуць у парадку самацёку. А на самацёк нацягаецца ніякім чынам нельга. Я [illegible] даў нядаўна тыя 60 заяў, якія паданы ў ВТНУ і там аказалася, што ёсьць 33 служачыя, 3 саматужнікі, 6 сялян, 5 дзяцей спэцыялістых і 12 іншых.

Трэба паставіць перад Наркампросам пытаньне аб тым, каб далі з усіх пабудоў цесьляроў для пабудовы студэнцкіх баракаў.

Нашым ВНУ патрэбны падручнікі на беларускай мове. Гэтай справай Наркамасьветы не займаецца да апошняга часу.

Трэба пры рэдакцыі газэты «Зьвязда» арганізаваць брыгаду рабочых па кантролі за падрыхтоўкай арганізацый да новага навучальнага году.

Тав. Гурпо (факультэт сав. будаўніцтва і права)

Патрэбны інстытут асьпірантаў

Наш друк надзвычай мала робіць у адносінах мабілізацыі ўсёй грамадзкасьці навокал падрыхтоўкі да навучальнага году.

Патрэбна спэцыяльная камісія па разьмеркаваньні дыпкаў, у сувязі з ліквідацыяй акруг.

Трэба рыхтаваць асьпірантаў не пасаматужнаму, як гэта ў нас робіцца, а аб'яднаць іх у адзін інстытут.

Вытворчая практыка складае ў [illegible] 54,9. Між тым, да гэтай справы надзвычай дрэнна адносяцца кіраўнікі ўстаноў. Прыдуць нашы студэнты на практыку — кіраўнікі ўстаноў гавораць: «Ну што-ж, практыкуйцеся». І «практыкуюцца» студэнты. Так, на заводзе «Бальшавік» 5 дзён студэнты-практыканты выгружалі скуру.

Наркамасьветы трэба заняцца пытаньнем аб студэнцкай сталоўцы.

Тав. Кроль (мэдфак)

Для мэдфаку павінны быць падручнікі

Курсы па падрыхтоўцы на мэдфак, якія перайшлі ў распараджэньне Наркамаховы здароўя, ня маюць цьвёрдага бюджэту, хутка ня будуць мець грошай. Між тым, там займаецца шмат дзяцей рабочых.

У нас адчыняецца новая клініка, але і дагэтуль ня вырашана пытаньне аб [illegible] для кухні, для пральні, што, бязумоўна, будзе адбівацца на работе ў клініцы.

Ёсьць пастанова СНК БССР аб пускуку грошай на пад

Ліквідацыю акруг правесьці з максымальнай арганізаванасьцю

Раён павінен стаць асноўным зьвяном сацыялістычнага будаўніцтва на вёсцы

Не дапушчаць ніякіх спроб узбуйненьня раёнаў.--Няўхільна выканаць баявую задачу---ня менш 90% акруговых работнікаў--у раён

Ліквідаваць акругі БССР да 1-га кастрычніка

ПАСТАНОВА Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў Беларускае ССР

У адпаведнасьці з пастановай ЦВК і СНК Саюзу ССР за 23 ліпеня 1930 г. «Пра ліквідацыю акруг», Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР ПАСТАНАЎЛЯЮЦЬ:

1. Правесьці ліквідацыю акруговых выканаўчых камітэтаў і ўсіх акруговых устаноў да 1-га кастрычніка 1930 г.

2. Усе правы і абавязкі акруговых выканаўчых камітэтаў перадаць раённым выканаўчым камітэтам, а таксама ў гарадох Менску, Віцебску, Гомелі, Бабруйску, Магілеве, Воршы, Полацку, Барысаве, Мазыры і Рэчыцы — гарадзкім саветам. Гарадзкія саветы паказаных гарадоў беспасрэдна падпарадкаваць Цэнтральнаму Выканаўчаму Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР.

3. Даручыць акруговым выканаўчым камітэтам не пазьней 15-га жніўня г.г. разьмеркаваць паміж гарадзкімі саветамі і раённымі выканаўчымі камітэтамі ўсе падпарадкаваныя акруговым выканаўчым камітэтам прадпрыемствы, сацыяльна-культурныя ўстановы, матар'яльныя сродкі і грашовыя абавязацельствы, прычым прадпрыемствы і сацыяльна-культурныя ўстановы на тэрыторыі гарадоў павінны быць перададзены гарадзкім саветам, а астатнія—раённым выканаўчым камітэтам.

Для разьмеркаваньня паказаных прадпрыемстваў і матар'яльных сродкаў арганізаваць спэцыяльныя акруговыя камісіі з 5 асоб на чале з старшынёю АВК з удзелам у патрэбных выпадках у рабоце гэтых камісій старшынь адпаведных РВК і гарсаветаў.

4. Ня менш 90 проц. адказных работнікаў акруг накіраваць на работу ў раёны. Адначасова з гэтым ужыць рашучыя меры да ўзмацненьня кадрамі сельскіх саветаў і паляпшэньня матар'яльнага становішча працаўнікоў раёну і сельскіх саветаў.

5. Арганізацыя раённай сыстэмы на паказаных вышэй пачатках павінна быць праведзена такім чынам, каб адміністрацыйныя выдаткі па кіраўніцтве на 30-31 бюджэтны год, як па дзяржаўным, так і па мясцовым бюджэце не перавышалі сум, асыгнаваных на ўтрыманьне акруговых і раённых апаратаў у 1929-30 г.

6. Замацаваць за раённымі выканаўчымі камітэтамі і гарадзкімі саветамі прыбыткі, якія былі прадастаўлены акруговым выканаўчым камітэтам, паводле адпаведнага законадаўства.

7. Увесьці з 1-га кастрычніка 1930 году самастойныя сельскія бюджэты ва ўсіх сельскіх саветах і прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам перадаць да 1-га кастрычніка г.г. сельскім саветам адпаведныя прадпрыемствы і іншыя крыніцы прыбыткаў.

8. Катэгарычна забараніць усякія зьмены існуючых межаў раёнаў і сельскіх саветаў на пэрыяд ліквідацыі акруг.

9. Прапанаваць усім народным камісарыятам цэнтральным установам і арганізацыям у 5-цідзённы тэрмін распрацаваць праекты патрэбных зьмен у структуры і штатах раённых і цэнтральных апаратаў, прадугледзеўшы ў праектах узмацненьне інструктарскай часткі гэтых апаратаў і праекты падаць Народнаму Камісарыяту РСІ.

10. Даручыць народным камісарыятам і цэнтральным установам і арганізацыям безадкладна ўстанавіць беспасрэдную сувязь з раёнамі і гарсаветамі. Пераходны пэрыяд да непасрэднай сувязі з раёнамі і гарсаветамі не павінен аслабіць правадзімых гаспадарчых кампаній.

11. Даручыць народным камісарыятам, цэнтральным установам і арганізацыям у месячны тэрмін распрацаваць і падаць у звычайным парадку ў законадаўчыя органы праекты зьмен існуючага законадаўства БССР, якія вынікаюць з гэтай пастановы.

12. Даручыць Савету Народных Камісараў распрацаваць у месячны тэрмін праект палажэньня пра раённыя зьезды саветаў, раённыя выканаўчыя камітэты і гарадзкія саветы і ўнесьці на разгляд і зацьверджаньне прэзыдыуму ЦВК БССР.

13. Даручыць упоўнаважанаму Наркампаштэлю ў 20-цідзённы тэрмін распрацаваць мерапрыемствы па ўзмацненьні паштовай, тэлеграфнай і радыё-сувязі з раёнамі і сельсаветамі і ўнесьці ў СНК.

14. Даручыць Дзяржпляну кантрольныя лічбы на 1930-31 г., а наркаматам і цэнтральным установам усе апэрацыйныя пляны пабудаваць у раённым і гарадзкім разрэзе.

Вык. аб. старшыні цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. ХАЦКЕВІЧ.

Нам. старшыні СНК БССР
К. БЭНЭК.

За сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. СТАШЭЎСКІ

26-га ліпеня 1930 г.
гор. Менск.

Твар рэарганізаванага апарату

Праект камісіі НК-РСІ

Учора ў НК-РСІ адбылося пасяджэньне камісіі па ліквідацыі акруг, на якой быў скончан разгляд праектаў структуры апаратаў, арганізацыі штатаў зарплаты і г. д. Усімі наркаматамі ўжо скончана складаньне праектаў, як цэнтральнага апарату, так і раённага і гарадзкога.

У аснову арганізацыі апарату паложана функцыянальная сыстэма. Усе аддзелы і пададдзелы, якія цяпер існуюць, зьнішчаны.

Пры пабудове савецкага апарату як гарадзкога, так і нізавога прымаецца пад увагу шчыльнасьць насяленьня і эканамічнае становішча гораду, раёну і сельсавету.

У якасьці чарнавога праекту, камісіяй прынята наступная структура апарату сельсаветаў, раёнаў і гарсаветаў.

Сельсаветы дзеляцца на тры групы. У першую групу ўваходзяць сельсаветы з насельніцтвам да 1.000 чал., у другую — з 1.000 да 4.000 і ў трэцюю звыш 4.000 чал. У першай групе апарат складаецца з 2-х чал., у другой з 3-х чал. і ў трэцяй — з 4-х чал.

Прымаючы пад увагу тое, што сельсаветам будзе перададзены цалкам бюджэт, а ў сувязі з гэтым і прамысловыя прадпрыемствы, якія знаходзяцца ў сельсавеце, у больш буйных сельсаветах (другая і трэцяя групы) уводзіцца пасада рахункавода-статыстыка. Намечана арганізацыя ашчадных кас пры ўсіх сельсаветах.

Раёны таксама дзеляцца на тры групы: першая з насельніцтвам да 40.000 чал., другая — раёны з насельніцтвам ад 40 да 75 тыс. і трэцяя група, у якую ўваходзяць раёны з насельніцтвам звыш 75.000 чал. У раёнах вышэйшай групы ўводзяцца пасады 2-х намесьнікаў старшыні РВК. Райвыканкомам надаюцца шырокія функцыі плянуючага падрадку. Гэтай работай кіруе адзін з намесьнікаў старшыні РВК; уводзіцца спэцыяльная пасада эканамістага-плянавіка.

Замест аддзелаў РВК, якія раней былі, уводзяцца інспэктары, у тым ліку па радзе новых галін работы: ліквідацыі няпісьменнасьці, сацыяльнага выхаваньня і г. д.

У зьвязку з важным значэньнем разьвіцця валютна-фондавых апэрацый, пры ўсіх РВК уводзіцца пасада інспэктара валютна-фондавай справы.

Намечана замест ранейшых начальнікаў адміністрацыйных частак пры РВК увесьці пасады інспэктароў па адміністрацыйнай частцы, якія адначасова будуць зьяўляцца і начальнікамі раённай міліцыі.

Гарсаветы дзеляцца на 4 групы: першая група—гарады з насельніцтвам да 16.000, другая — ад 16 да 40 тыс., трэцяя — ад 40 да 75 тыс. і чацьвертая з насельніцтвам звыш 75 тыс.

Мяркуецца, каб гарсаветы дробных гарадоў з насельніцтвам да 16 тыс. чал., знаходзіліся ў падпарадкаваньні райвыканкомаў. У больш буйных гарадох гарсаветы самастойныя. У гарсаветах буйных гарадоў — Менску, Гомелю, Віцебску, Бабруйску і Магілеве уводзяцца пасады двух намесьнікаў старшыні гарсавету, з якіх адзін кіруе пытаньнямі плянава-эканамічнымі, другі — камунальна-бытавымі. У гарадох з насельніцтвам да 40 тыс. чал. пасада намесьніка старшыні гарсавету ня ўводзіцца. У гарсаветах буйных гарадоў уводзяцца пасады інспэктара па нацыянальных пытаньнях, рацыяналізатара, гарадзкога архітэктара і эканамістага-плянавіка.

Пытаньне аб рэарганізацыі цэнтральнага апарату будзе разглядацца камісія па наступным пасяджэньні.

А.

90 проц. акруговых работнікаў --у раёны Меншчыны

Менскі акругком партыі прыняў меры да выкананьня дырэктыў XVI зьезду УсеКП(б), аб ліквідацыі акруг.

Зараз пасланы брыгады з камуністых ва усе раёны Меншчыны, з мэтаю правядзеньня падрыхтоўчай работы да ліквідацыі акругі. Гэтым-жа брыгадам даручана дапамагчы правядзеньню ўборачнай кампаніі і выкананьню дырэктыў партыі ў гапіне жывёлагадоўлі.

Раённым камітэтам партыі даны дырэктывы аб недапушчэньні ні ў якім разе паслабленьня тэмпаў выкананьня чарговых гаспадарча-палітычных кампаній.

Сакратарыят АК КП(б)Б займаецца зараз разьмеркаваньнем акруговых работнікаў. З 140 чал. — 125 (90 проц.) будуць накіраваны ў раёны. Гэтым самым значна узмацняцца апараты райвыканкомаў.

29-га ліпеня адбудзецца пленум АКК і АК КП(б)Б, які вызначыць канчатковы тэрмін скасаваньня Менскай акругі. На пленуме т. СЛАВІНСКІ зробіць даклад аб ліквідацыі акругі і чарговых задачах партарганізацыі.

Л.

Падрыхтоўка на Аршаншчыне

ВОРША, (наш кар.). Падрыхтоўка да ліквідацыі акругі толькі пачалася. Акрвыканком запатрабаваў ад ўсіх РВК іх меркаваньні па пытаньні ліквідацыі акругі і ўзмацненьня раёнаў і сельсаветаў.

Акруговая кантрольная камісія ўжо падала ў цэнтр свае меркаваньні. Яна лічыць патрэбным, каб у 6-ці больш буйных раёнах Аршаншчыны былі арганізаваны РКК-РСІ, а ў іншых 8-мі раёнах устаноўлен інстытут упоўнаважаных РСІ.

Акрпрафбюро таксама мяркуе ў буйных раёнах арганізаваць раённыя бюро прафэсыянальных саюзаў, а ў іншых раёнах асобных упоўнаважаных па прафлініі.

Вось і ўсё, што зроблена пакуль па Аршаншчыне ў адносінах ліквідацыі акругі. Працаўнікі яшчэ не разьмеркаваны, бо няма яшчэ ніякіх паказаньняў з цэнтру—хто застаецца за ЦК, каго пасылае акруговы камітэт.

Вакол ліквідацыі не мабілізавана грамадзкасьць

ВІЦЕБСК. (Наш. кар.). «Ва ўсёй работе па ліквідацыі акругі трэба выходзіць з асноўнай задачы максымальнага набліжэньня партыйнага, савецкага, прафсаюзнага і каапэрацыйнага апаратаў да раёну і вёскі». Так гаворыць пастанова ЦК УсеКП(б) ад 15 ліпеня. Пастанова, здаецца, ясная і зразумелая, якая патрабуе неадкладнага ажыцьцяўленьня.

Што зроблена Віцебскімі арганізацыямі для выкананьня гэтай дырэктывы? Трэба падкрэсьліць, што ў Віцебскай паказальнай акрузе дагэтуль зроблена вельмі мала.

Нарада інструктароў, якая была склікана АВК, была сарвана, бо самі арганізатары нарады не зьявіліся. Акруговая газэта «Віцебскі Пралетары» мала ўвагі ўдзяляе пытаньню ліквідацыі акругі.

Акруговы зьезд спажывецкай каапэрацыі, які нядаўна адбыўся, ня лічыў патрэбным займацца такім «няпрыемным» пытаньнем, як ліквідацыя акругі.

Грамадзкасьць не мабілізавана вакол такога важнага палітычнага і эканамічнага мерапрыемства, як ліквідацыя. Яшчэ не намечаны канкрэтныя вехі рэарганізацыі партыйнага, савецкага, прафсаюзнага і каапэрацыйнага апарату. Мясцовыя органы напэўна лічаць, што ім няма чаго займацца гэтым пытаньнем, цэнтр прышле цыркуляр і мы «ліквідуемся».

Партыйным, савецкім і інш. арганізацыям трэба неадкладна ўзяцца за падрыхтоўку да бесьперабойнага пераходу рэарганізаваных апаратаў на новыя умовы работы.

ЗАКІС.

Аддзяленьні дзяржбанку—у кожным раёне

(У парадку прапановы)

Тав. Ракаў у сваім артыкуле аб ліквідацыі акруг, зьмешчаным у «Зьвязьдзе», падкрэсьліў, што Дзяржбанк павінен апірацца ў раёне на с.-г. крэдытныя таварыствы. Гэта пастаноўка пытаньня, на нашай думцы, спрошчаная і ня новая.

Сельгаскрэдытныя таварыствы па сваёй структуры, па сваіх сілах ня могуць ажыцьцяўляць функцыі дзяржаўнага банку на раёне і тым самым ня могуць ператварацца ў адзіную раённую крэдытную ўстанову, праз якую трэба будзе праводзіць палітыку партыі аб давядзеньні крэдытаў да раёну.

Ёсьць факты, якія сьведчаць аб гэтым, іх можна перадаць ва ўрадавую камісію па ліквідацыі акруг.

Мы лічым, што ва ўмовах, якія стварыліся пасьля крэдытнай рэформы, ва ўмовах доцэнтралізацыі крэдыту нам трэба ажыцьцявіць задачу арганізацыі філіялаў дзяржбанку ў раёнах і вёсках.

СТАНКЕВІЧ.

УСЕ НА ДАПАМОГУ

абароне СССР і палітвязьням буржуазных вастрогаў

Да ўсіх арганізацый МОПР'у і ТСА Авіяхіму БССР

да ўсіх рабочых, калгасьнікаў і працоўнага сялянства БССР

Таварышы! 16 год таму назад пануючыя буржуазныя клясы Эўропы запалілі агонь сусьветнай вайны, каб пановаму падзяліць зямлю і каб са сьвежай сілай пачаць рабаваць прыгнечаныя народы ўсяго сьвету.

Дзесяць мільёнаў чалавек, пахаваных на палёх Эўропы, дзесяткі мільёнаў калек-інвалідаў, удоў, сірот, тысячы і тысячы разбураных дашчэнту гарадоў, мястэчак і вёсак — вось тая цана, якой працоўныя ўсяго сьвету заплацілі за гэту вайну.

Ніколі мы гэтага не забудзем.

Але-ж, памятаючы аб крывавых уроках імпэрыялістычнай вайны 1914 г., трэба адначасова моцна памятаць аб тым, што сёньня буржуазія ўсіх краін рыхтуе новую імпэрыялістычную вайну. Асаблівa энэргічна працуе сусьветны імпэрыялізм у напрамку падрыхтоўкі контр-рэвалюцыйнай вайны супроць СССР — бацькаўшчыны міжароднага пралетарыяту — для таго, каб сарваць нашае сацыялістычнае будаўніцтва, бо яно зьяўляецца самым страшэнным ворагам для сусьветнага капіталізму.

У Міжнародны Чырвоны Дзень (1 жніўня) рабочыя і працоўныя масы СССР і ўсяго сьвету зноў выйдуць на вуліцы для змаганьня супроць ваеннай небясьпекі, супроць ваенных нападаў на нашу савецкую краіну.

Буржуазія ва ўсіх краінах таксама рыхтуецца да Міжнароднага Чырвонага Дня: ужо новыя сотні рэвалюцыйных рабочых, сялян, камсамольцаў пасаджаны ў турмы для таго, каб перашкодзіць кампаніі барацьбы супроць ваеннай небясьпекі. Аднак мы ўпэўнены ў тым, што ніякім сілам ня ўдасца сарваць правядзеньне Міжнароднага Чырвонага Дня.

Пралетарыят і працоўныя масы яшчэ шчыльнейшымі радамі пакажуць міжароднаму імпэрыялізму свае сілы. Аб гэтую сілу ўшчэнт разаб'юцца ўсе ваенныя пляны і махінацыі імпэрыялістычнай буржуазіі і фашызму.

А мы з свайго боку перад тварам ваеннай небясьпекі павінны зрабіць усё для нас магчымае, каб яшчэ больш узмацніць абароназдольнасьць нашай савецкай краіны і каб яшчэ інтэнсіўней прыйсьці на дапамогуахвярам сусьветнага фашызму, тым нашым зарубежным братом, якія змагаюцца супроць імпэрыялістычнай вайны, за абарону СССР. Цэнтральны Камітэт МОПР'у БССР і Цэнтральны савет ТСА Авіяхіму БССР зварочваецца да ўсіх арганізацый МОПР'у і ТСА Авіяхіму, да ўсяго мопраўскага і авіяхімаўскага актыву правесьці па ўсіх гарадох, мястэчках і вёсках кружачны збор у карысьць абароны краіны і палітзьняволеных буржуазных вастрогаў.

Таварышы! Мабілізуйце ўсе жывыя сілы для таго, каб у Жнівеньскія дні (1-га, 2-га і 3-га жніўня) правесьці гэты кружачны збор з максымальным посьпехам, каб не прапусьціць ніводнага прадпрыемства, ніводнай установы, ніводнага калгасу, саўгасу ні водной вёскі.

Ячэйкі МОПР'у і ТСА Авіяхіму, самі вазьмецеся актыўна за гэту справу. Настаўнікі і камсамольцы будзьце за стрэльшчыкамі ў правядзеньні гэтага важнага мерапрыемства.

Рабочыя і працоўныя масы гораду і вёскі! Як і заўсёды, падтрымайце нашы арганізацыі ў правядзеньні гэтага важнага мерапрыемства ў імя інтарэсаў абароназдольнасьці нашае краіны і інтарэсаў міжнароднай пралетарскай салідарнасьці.

Няхай мацнее салідарнасьць рабочых і працоўных мас усяго сьвету!

Няхай мацнее наш савецкі саюз — апора міжнароднай пралетарскай рэвалюцыі!

Няхай жыве сусьветны камунізм!

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ МОПР'У БССР

ЦЭНТРАЛЬНЫ САВЕТ ТСААВІЯХІМУ БССР.

Пазыка „Пяцігодка за чатыры гады" мабілізуе новыя мільёны на сацыялістычнае будаўніцтва

Пагалоўнай падпіскай на пазыку забясьпечым датэрміновае выкананьне пяцігодкі

Першыя вынікі

Больш за 10 дзён прайшло з таго часу, як пачалася кампанія рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка за чатыры гады». За гэты час па ўсіх гарадох БССР разгарнулася самая шырокая падпіска на новую пазыку. З многіх заводаў і фабрык БССР паведамляюць аб вялікім уздыме, з якім рабочыя сустрэлі пачатак падпіскі. Па аднэй толькі менскай ашчаднай касе падпіска ўжо дасягнула 400.000 руб. Гэта ў той час, калі многія рабочыя і служачыя знаходзяцца ў водпуску, калі па кожным прадпрыемстве не хапае дзесяткаў рабочых і служачых.

Надзеі апартуністых па тое, што падпіска на пазыку «Пяцігодку—за чатыры гады» праваліцца, былі разьвеяны першымі-ж днямі падпіснай кампаніі.

З Бабруйску паведамляюць, што па асобных цэхах бабруйскага камбінату падпіска перавысіла двухтыднёвы фонд зарплаты. Ёсьць выпадкі падпіскі асобных рабочых на 100 і больш процантаў месячнай зарплаты.

Паміж прадпрыемствамі разгортваецца сацыялістычнае спаборніцтва на лепшую падпіску—**заводамі «Бальшавік» і «Энергія», бабруйскім камбінатам** і швэйнай фабрыкай імя Дзяржынскага і г. д.

Ня гледзячы на гэтыя посьпехі, нельга ні ў якім разе быць здаволенымі дасягнутымі вынікамі—на пекатэрых прадпрыемствах падпіска праходзіць самацёкам, без належнай растлумачальнай работы, фабзаўкомы прымаюць слабы ўдзел у кампаніі, насьпенгазэты не адлюстроўваюць ходу падпіскі, у многіх установах уся агітацыйная работа абмяжоўваецца пастаноўкай дакладаў на агульным сходзе.

Вельмі слаба праводзіцца кампанія па раёнах. Раённыя камісіі садзейнасьці бязьдзейнічаюць. Мясцовая грамадзкасьць ня ўцягнута ў работу. Падпіска толькі пачынаецца, месцамі дапушчаны памылкі пры разьмеркаваньні кантрольных лічбаў.

Прафарганізацыі на вёсцы ня прымаюць ніякага ўдзелу ў разгортваньні падпіскі. Замест таго, каб дапамагчы падпіснай кампаніі ў калгасах і саўгасах, саюзы сельгаслесрабочых, мэдсанпрацы, працасьветы сядзяць, склаўшы рукі, чакаючы вынікаў... самацёку.

Ня ўжываецца мэтад пралетарскага буксіру лепшых прадпрыемствамі адсталых. Шэфскія арганізацыі, кіруючыя органы калгаснай сыстэмы яшчэ ня ўключыліся ў кампанію.

У бліжэйшыя тыдні трэба будзе дабіцца разгортваньня парыскі на вёсцы і пераключэньня ўвагі прафсаюзных арганізацый да кампаніі рэалізацыі.

28 проц. кантрольнай лічбы

Паводле даных менскай акруговай ашчаднай касы, на прадпрыемствах і ўстановах г. Менску, прымацаваных да касы, падпіска на пазыку «Пяцігодка за чатыры гады» дасягнула 400.000 руб. пры агульнай суме заданьня ў 1.424 тыс. руб., што складае 28 проц. кантрольнай лічбы.

Ахоплена падпіскай 40,3 проц. фонду двухтыднёвай заработнай платы.

На першым месцы--дрэваапрацоўчы камбінат

БАБРУЙСК. (Наш кар.). На першым месцы па рэалізацыі пазыкі ў горадзе ідзе ДРЭВААПРАЦОЎЧЫ КАМБІНАТ, які далёка пакінуў за сабой іншыя прадпрыемствы.

На 25-га ліпеня агульная сума падпіскі па камбінаце дасягнула 49.000 рублёў. Па белдрэўным цэху падпіска дасягае 132 проц. двухтыднёвага заработку, па мэханічнай майстэрні — 120 проц.; прычым трэба мець на ўвазе, што частка рабочых знаходзіцца ў водпуску. Падцягваюцца і адсталыя цэхі камбінату—будэўнічы аддзел, лесазавод № 7.

Зараз камбінат заключыў сацдагавор з швэйнай фабрыкай імя Дзяржынскага на лепшую падпіску. Паводле ўмовы спаборніцтва, лепшае па падпісцы прадпрыемства атрымае месца ў камісіі па тыражы 3-й пазыкі індустрыялізацыі ў Менску.

Партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі камбінату правялі шырокую масавую растлумачальную работу аб значэньні пазыкі ва ўсіх цэхах.

К—т.

На асновах грамадзкай ініцыятывы і добраахвотнасьці

(З абежніку ЦВК БССР)

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту разаслаў цыркуляр усім выканаўчым камітэтам і саветам БССР. У цыркуляры падкрэсьліваецца, што кампанія рэалізацыі пазыкі мае надзвычайна важнае палітычнае і эканамічнае значэньне. Новая пазыка павінна ўцягнуць сотні мільёнаў рублёў у сацыялістычнае будаўніцтва.

Прэзыдыум ЦВК прапануе ўсім савецкім органам забясьпечыць выкананьне кантрольных лічбаў у вызначаныя тэрміны, праводзіць штодзённае кіраўніцтва ходам кампаніі, ажыцьцяўляць сыстэматычны нагляд за работай фінансавых, крэдытных устаноў і ашчадных кас. Кампанію па рэалізацыі пазыкі «Пяцігодку—за чатыры гады» трэба ўвязаць з іншымі гаспадарча-палітычнымі кампаніямі.

Трэба прыцягнуць да папулярызацыі пазыкі ўсе савецкія ўстановы, прафсаюзныя і грамадзкія арганізацыі, гарадзкі і вясковы актыў. Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на разьмеркаваньне пазыкі ў індывідуальным сэктары сельскай гаспадаркі.

Поўная добраахвотнасьць і грамадзкая ініцыятыва павінна быць паложаны ў аснову кампаніі рэалізацыі новай пазыкі.

Зводка ходу падпіскі

За апошнія дні падпіска на пазыку «Пяцігодка — за чатыры гады» ахапіла ўсе прадпрыемствы г. Менску.

Рабочыя фабрыкі «КАСТРЫЧНІК» падпісалі на 78.000 руб., што складае 110 проц. іх двухтыднёвага заработку.

На ЗАВОДЗЕ «КАМУНАР» падпіскай ахоплена 52 проц. рабочых, якія падпісаліся на 36.000 руб. пры двухтыднёвым фондзе зарплаты ў 73 тысячы руб. Рабочыя ЗАВОДУ «ЭНЭРГІЯ» падпісаліся на 22.900 руб., што складае 51 проц. двухтыднёвага фонду зарплаты. Падпіскай ахоплена 53 проц. рабочых. На АБУТКОВАЙ ФАБРЫЦЫ падпіскай ахоплена 60 проц. рабочых, якія падпісаліся на 25.000 руб., што складае 80 проц. двухтыднёвага заработку.

Фабком «АДРАДЖЭНЬНЕ» вестак аб падпісцы ня мае, падпіска там ідзе самацёкам

Дрэнна абстаіць справа з падпіскай на пазыку сярод сэзоннікаў. Прафсаюзным арганізацыям трэба павесьці сярод сэзоннікаў шырокую растлумачальную кампанію.

Падпіска ў камітэце ўзаемадапамогі

24-га чэрвеня была склікана нарада актыву менскага гарадзкога камітэту ўзаемадапамогі, на якой абгаварвалася пытаньне аб рэалізацыі пазыкі. Выступаўшыя адзначылі, што лепшай агітацыяй за пазыку будзе падпіска саміх актывістых у першую чаргу. З прысутных 21 чал., 5 падпісалася на месячны заработак, 2—на 75 проц. месячнага заработку і 12 чал. на двухтыднёвы заработак. Работніцы Бэрштэйн, Канцлер і Кацовіч падпісаліся на 100 проц. месячнага заработку.

Нарада пастанавіла разгарнуць шырокую кампанію па распаўсюджаньні пазыкі і выклікаць на сацыялістычнае спаборніцтва ўсе гарадзкія камітэты ўзаемадапамогі БССР.

Усім ячэйкам МОПР'у Кастрычніцкага райкому.

27 ліпеня а 7 г. веч. у памяшк. Акруткому МОПР'у (Савецкая, 87,2-гі паверх) адбудзецца

НАРАДА БЮРО ЯЧЭЕК МОПР'у,
рэўкамісіі і актыву Кастрычніцкага райкому.

У парадку дня—пытаньне аб перавыбарчай кампаніі МОПР'у.

—) ПРОСЬБА ЗЬВЯЦЦА СВАЯЧАСОВА. (—

Кастрычніцкі РК МОПР'у.

Хто ідзе наперадзе, хто ганебна адстае

АПЭРАЦЫЙНАЯ ЗВОДКА ЗМАГАНЬНЯ ЗА ПРАМФІНПЛЯН

(Паводле матар'ялаў ВСНГБ)

Прамысловасьць БССР за 9 месяцаў поўнасьцю праграму ня выканала. З 60 найбольш буйных прадпрыемстваў, поўнасьцю выканалі прамфінплян толькі 13. Пралетарская грамадзкасьць павінна ведаць хто ідзе наперадзе, хто адстае. На гэта пытаньне дае адказ наступная табліца, якая характарызуе выкананьне пляну па кожным прадпрыемстве ў паасобку.

Прадпрыемствы, якія выконваюць плянавыя заданьні як па выпуску прадукцыі, так і па зьніжэньні сабекошту

Назва прадпрыемства.	Процант выкананьня вытворчай праграмы.	Зьніжэньне сабекошту.	
		На пляну.	За 8 м-даў.
Гута «Пралетары»	101,9	—7,3	—7,2
Гута «Камінтэрн»	129,2	—7,1	—8,8
Гута імя Ільліча	114,8	—5,0	—6,2
Мэталязавод «Чырв. Адраджэньне»	113,9	—35,0	—34,7
» «Чырв. Кастрычн.»	100,0	—6,9	—8,5
Швэйн. ф-ка «Кастрычнік»	99,6	—11,8	—14,0
» » «Камінтэрн»	105,0	—9,0	—10,0
Панчошна-трыкат. ф-ка	104,4	—10,6	—10,2
Гарбарня імя Лекерта	126,3	—4,0	—6,1
Маслабойны зав. ім. Калініна	117,4	—6,65	—7,3 (за 7 м.)
Цукеркав. ф-ка «Х Кастрычніка»	107,7	—10,9	—17,1
Картопная ф-ка імя Леніна	100,8	—16,0	—16,3
Шпалерн. ф-ка імя Вароўскага	103,4	—10,9	—16,2

Прадпрыемствы, якія выконваюць толькі кольказныя заданьні, але правальваюць зьніжэньне сабекошту.

Назва прадпрыемства.	Процант выкананьня вытворчай праграмы.	Зьніжэньне сабекошту.	
		На пляну.	За 8 м-даў.
Мэталязавод «Камунар»	104,7	—32,8	—26,2
Магілев. швэйн. ф-ка.	100,1	—10,6	—8,5
Гарбарная «Пралетарскі Шлях»	105,2	—5,0	+0,7
Запалкавая ф-ка «Пралет.-Перамога»	103,3	Па пляну сабекошт скрынкі 4,06 р., а фактычна—4,65 р.	
Запалкавая ф-ка «Х Кастрычнік»	100,0	—14,2	8,2
Бровар. імя Бебеля	112,0	—11,3	—1,2
» «Пралетары»	143,3	—1,8	+3,2
» «Беларусь»	132,8	—6,7	3,1
Маслабойны зав. «Зара»	99,6	—6,0	—5,2
» » імя Адзярыхі	103,8	—3,7	—5,0
Махорачн. ф-ка	113,0	—6,2	—3,6
Папяров. ф-ка «Прафінтэрн»	102,1	—19,0	11,9
» » «Гэроі Працы»	100,3	—12,1	—6,7
Картон. ф-ка імя Вароўскага	106,8	—16,0	—12,7
Друкарня імя Сталіна	99,5	—10,0	—6,6
Друкарня «Палесдрук»	105,0	—29,4	—23,3

Прадпрыемствы, якія выконваюць заданьні па зьніжэньні сабекошту, але маюць прарыў па выпуску прадукцыі.

Назва прадпрыемства.	Процант выкананьня вытворчай праграмы.	Зьніжэньне сабекошту.	
		На пляну.	За 8 м-даў.
Мэталязавод «Рух. Рэвалюцыі»	97,0	—3,8	—4,0
Ільна-ф-ка «Дзьвіна»	91,9	—11,3	—10,5
Віцебск. абутков. ф-ка	85,1	—11,3	—10,2
Дражджавы зав. «Пралетары»	85,3	—14,4	—14,1
Дражджавы завод «Чырв. Зорка»	88,3	—6,2	—9,3
» » «Вызвал. Праца»	91,8	—21,6	—22,7
Цукеркав. ф-ка «Камунарка»	79,3	—9,2	—17,4
Гута «Ноўкі».	88	—7,5	—7,5

Прадпрыемствы, якія ня выконваюць пляна як па выпуску прадукцыі, так і па зьніжэньні сабекошту.

Назва прадпрыемства.	Процант выкананьня вытворчай праграмы.	Зьніжэньне сабекошту.	
		На пляну.	За 8 м-даў.
Гута «Кастрычнік.	95,3	—13,7	—6,1
» «Труды»	93,0	—7,3	—1,4
Мэталязавод «Чырв. Мэталісты»	90,8	—12,3	—7,1
» «Энэргія»	94,1	—17,1	—13,2
«Пралетары»	94,0	—16,5	—9,9
Цьвікавы завод «Інтэрнацыянал»	88,4	—7,3	—5,6
Гомсельмаш	82,5	—	—
Ільнапрадз. ф-ка імя К. Маркса	69,1	—22,3	—11,5
«Дняпроўская Мануфактура»	83,5	—13,7	5,9
Сукон. ф-ка «Якаўл. Мануфакт».	81,6	—14,6	—5,3
Галянтарэйная ф-ка	78,0	няма вестак	
Віцебск. швэйн. ф-ка «Прафінтэрн»	95,9	—8.	—7,1
Швэйная ф-ка імя Дзяржынскага	91,9	—	—
Гарбарня «Бальшавік»	89,3	—11,6	—4,6
Віцебская гарбарня	91,9	—3,0	—0,5
Менская абутк. ф-ка	89,9	—9,7	—5,1
Гомельская абутков. ф-ка	61,4	—20,0	—3,2
Запалкавая ф-ка «Чырв. Бярэзіна»	96,4	9,8	—4,9
» » «Дняпро»	89,0	—13,6	—3,0
» » «Вазуні»	97,2	—10,6	—0,8
Завод «Чырвоны Хімік»	96,0	—18,0	—14,9
Папяровая ф-ка «Чырвон. Зорка»	98,8	—12,5	—7,9
Акулярная ф-ка	86,7	20,5	—10,8

Такім чынам, як відаць з табліцы, большасьць прадпрыемстваў ня выконвае прамфінпляну і да гэтага часу ня ліквідавала сваіх прарываў. Гэта сьведчыць аб тым, што адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал, а таксама пізавыя партыйныя, і прафэсыянальныя ячэйкі гэтых прадпрыемстваў не перабудавалі сваёй работы ў адпаведнасьці з неабходнасьцю ліквідацыі прарываў.

Гэтыя прадпрыемствы павінны неадкладна мабілізаваць усе сілы і энэргію і зрабіць усё магчымае, каб хоць на працягу 4-га квартылу, на блізіць лічбы выкананьня прамфінпляну да плянавых заданьняў.

Паклады граніту ў БССР

Новая крыніца будаўнічых матар'ялаў для дарожнага будаўніцтва

Разьведачныя работы (бурэньне) на гранітах у Глушкавічах, Лельчыцкага раёну, Мазырскай акругі.

Запатрабаваньне на камень, у сувязі з пашырэньнем нашага будаўніцтва, вялізарнае. Пры самай вялікай інтэнсыўнай рабоце па БССР штогодна можна было сабраць толькі 25—30 тыс. вагонаў розных валуноў, што зьяўлялася вельмі недастатковым.

Дарожнае і жыльлёвае будаўніцтва, якое зараз шпаркім тэмпам разьвіваецца, прад'яўляе запатрабаваньне на вялікую колькасьць каменьня і ў бліжэйшыя гады патрабуецца яго ня менш і млн. вагонаў.

Здабыча звычайнага камня, такім чынам зьяўляецца адной з важных умоў разгортваньня дарожнага і жыльлёвага будаўніцтва. Мы стаім перад сур'ёзнай небясьпекай недахвату камня, які нам патрэбен для пашырэньня будаўніцтва.

Горны аддзел ВСНГ накіраваў усю сваю ўвагу і досьледы на адшуканьне патрэбнага камня ў межах БССР. Зараз гэта важнейшая праблема амаль цалкам вырашана.

У глухім Лельчыцкім раёне, Мазырскай акругі каля вёскі Глушкавічы, шляхам досьледаў, закладкі буравых сважын, было выяўлена, што там ёсьць вялікія карэнныя паклады крышталёвых парод граніту. Як высьветлілася, гэты вучастак у раёне Глушкавічы зьяўляецца працягам украінскай гранітнай грады, якая ў раёне ракі Ўбарцы прылягае да БССР.

Гэтыя граніты ў некаторых мясцох выступаюць проста на паверхню ў выглядзе вялікіх каменных глыб. Акрамя гэтага, большая частка граніту залягае на глыбіні 2—10 мэтраў вялікімі пластамі. Уся мясцовасьць запоўнена ўзвышшамі, вакол якіх раскінуты балоты. Дно гэтых балотаў таксама гранітнае.

На месцы пакладаў у Глушкавічах ужо вядуцца распрацоўкі, працуюць дасьледчыя рабочыя групы горнага аддзелу з тым, каб дасканала вывучыць разьмеры пакладаў і ўмовы здабычы граніту. Пакуль што дасьледвана толькі плошча ў 100 гэкт., якая, паводле самых грубых падлікаў, можа штогодна даваць да 50 тысяч вагонаў граніту самай высокай якасьці.

Трэба адзначыць, што акрамя граніту, плошча гэта вельмі багата іншымі выкапнямі. Там-жа ёсьць агнятрывалыя гліны і каолины. Гэтыя матар'ялы вельмі каштоўныя для вырабу агнятрывалых матар'ялаў, фаянсавай пасуды і г. д.

Зразумела, што гэты вучастак поўнасьцю здаволіць патрэбы Беларусі ў каменьні на можа. Горны аддзел ВСНГ зьвярнуўся ў галоўнае горнае кіраўніцтва з просьбай далучыць да гэтага вучастку вучастак у раёне ракі Овруч, які знаходзіцца на Украіне, ля самай мяжы БССР, каля Глушкавічаў. На гэтым вучастку распрацоўкі зусім не вядуцца і калі распрацоўка будзе перадана горнаму аддзелу ВСНГВ, патрабасьць Беларусі ў каменьні будзе цалкам задаволена.

Горны аддзел ВСНГ узьняў пытаньне аб пабудове спэцыяльнай чыгуначнай лініі да месца гранітных распрацовак. Трэба адзначыць, што ў гэтым раёне ёсьць вялікія лясныя масывы, якія дагэтуль таксама не распрацоўваліся з прычыны адсутнасьці транспарту.

Горны аддзел вынікі сваёй дасьледчай работы пакажа на Усебеларускай сельска-гаспадарчай і прамысловай выстаўцы. Будуюцца спэцыяльныя штольні, будуць выстаўлены ўзоры глушкавіцкіх граніту, з якіх будзе пабудавана спэцыяльная піраміда. На выстаўцы будзе пастаўлена фарфаровая пасуда з агнятрывалай гліны і каолину.

Арк.

Новы тарыф на электраэнэргію

Камунальная сэкцыя гарсавету ўнесла ў прэзыдыум гарсавету праект новага, больш таннага тарыфу на электраэнэргію. Іншавіды, пэнсыянэры, беспрацоўныя, рабочыя і служачыя, якія атрымліваюць невялікую пэнсію, паводле гэтага праекту будуць плаціць, замест 14 кап. за 1 кілёват-гадзіну—8 кап. Іншыя члены саюзаў, а таксама саматужнікі, якія не карыстаюцца наёмнай працай — замест 20 кап. за кілёват-гадзіну будуць плаціць 16 кап. Тарыф для ўстаноў устаноўлены ў 30 кап., для крам 50 кап. і для невялікіх прамысловых прадпрыемстваў 12 кап., для вялікіх прадпрыемстваў устаноўлена дыфэрэнцыраваная плата ад 35 кап. да 2 руб. за кілёват-гадзіну.

Даведнік пайшчыка

МЦРК пачаў выдаваць пайшчыкам на наборных кніжках цукар за жнівень па талёну ружовага колеру № 40. Нормы выдачы ранейшыя.

Выдаюцца таксама крупы па 1½ кілё на едака для 1-й катэгорыі і па 1 кілё для 2-й і 3-й катэг., рыба салёная—1 кілё для 1-й кат., 1 ½ кілё для 2-й і 3-й кат.; мыла гаспадарчае для 1-й катэгорыі—1 кавалак, для іншых—па ½ кавалку.

Сухары, пячэньне і пернікі будуць адпускацца выключна на дзіцячых кніжках дзецям пайшчыкаў да 5 год па 250 гр. на дзіцё—па талёну ружовага колеру 32.

МЦРК пачынае выдаваць на наборных кніжках з буфэтаў пры прадпрыемствах і ларкоў №№ 6, 27 і 30 папяросы тым пайшчыкам, якія яшчэ не атрымалі папіросы, па талёнах № 282, 283, 285 і 287 па дзьве пачкі на талён і па часовых картках па талёне № 12.

Усебеларуская выстаўка адкрываецца 10 жніўня

Скончыць усю падрыхтоўчую работу да 1 жніўня

Гэтымі днямі адбыўся пленум галоўнага выставачнага камітэту, на якім быў заслуханы даклад дырэкцыі аб правядзенай рабоце па падрыхтоўцы да адкрыцьця выстаўкі. ПЛЕНУМ ВЫЗНАЧЫЎ АДКРЫЦЬЦЁ ВЫСТАЎКІ НА 10 ЖНІЎНЯ. Агульны каштарыс арганізацыі выстаўкі зацьверджан у суме 1.600 тыс. рублёў.

Пленум адзначыў, што, ня гледзячы на скончэньне будаўніцтва павільёнаў, з-за нядбайных адносін наркаматаў і цэнтральных устаноў, затрымалася ўнутранае мастацкае афармленьне павільёнаў і ўстаноўка экспанатаў.

ПЛЕНУМ ВЫСТАЎКОМУ ПРАПАНАВАЎ УСІМ УСТАНОВАМ СКОНЧЫЦЬ МАСТАЦКАЕ АФАРМЛЕНЬНЕ ПАВІЛЬЁНАЎ І ЎСТАНОЎКУ ЭКСПАНАТАЎ НЕ ПАЗЬНЕЙ 1-га ЖНІЎНЯ.

Наркамзему і Калгасцэнтру прапанавана зараз-жа мабілізаваць усе сілы і сродкі, каб поўнасьцю выявіць на выстаўцы аграмаджаны сэктар сельскай гаспадаркі. Экспанаты павінны быць дастаўлены да 1-га жніўня.

Выстаўком адзначыў, што ЦСПСБ і Менгарсавет дагэтуль нічога не зрабілі, каб падрыхтаваць памяшканьні для экскурсантаў і нападзіць іх культурна-бытавое абслугоўваньне.

Менгарсавет павінен забясьпечыць праезд экскурсій на выстаўку трамвайнай колькасьцю трамвайных вагонаў і ўстанавіць спэцыяльную аўтобусную лінію, раўналежную трамвайнай, нападзіць курсаваньне аўтобусаў ад выстаўкі на балотную і ільняную станцыі.

Палесдруку прапанавана скончыць друкаваньне ўсёй заказанай колькасьці спадарожнікаў па выстаўцы.

Рвачу і гультаю—ня месца ў радох спэцыялістых

Інжынэр Парэмбскі Р. С. прапрацаваў 3½ месяцы ў Белкалгасбудзе.

Спэцыялістыя Белкалгасбуду ня раз абураліся паводзінамі інжынэра Парэмбскага.

У чэрвені г.г. інжынэр Парэмбскі быў камандыраваны ў Гарадзецкі агра-індустрыяльны камбінат для ўдзелу ў рабоце камісіі па выбары месца для пабудовы крухмальнага заводу. Прыбыўшы на станцыю Жлобін, Парэмбскі паслаў тэрміновую тэлеграму агра-індустрыяльнаму камбінату: «Прыбыў прадстаўнік камісіі, шлеце коняй». Усьлед за тэлеграмай ён пазваніў па тэлефоне і патрабаваў неадкладна прысылаць аўто, або экіпаж на дутых шынах.

Камбінат, ня маючы ні коняй, ні аўто, якія былі ў разьезьдзе, рэкамэндаваў Парэмбскаму наняць падводу за кошт камбінату.

«Абураны» такім адказам, Парэмбскі кінуў тэлефонную трубку, сеў на цягнік і вярнуўся ў Менск, ня выканаўшы важнейшага даручэньня Белкалгасбуду і сарваўшы работу камісіі.

Спэцыялістыя агра-індустрыяльнага камбінату паслалі ў Белкалгасбуд наступную тэлеграму: «Абураны ўчынкам інжынэра Парэмбскага». Гэты ўчынак быў таксама аднадушна і рашуча асуджаны ўсім калектывам Белкалгасбуду.

Агульны сход калектыву высунуў перад МВІТ пытаньне аб выключэньні Парэмбскага з радоў інжынэрна-тэхнічных работнікаў. Парэмбскі быў зьняты з работы і выкінуты з радоў калектыву Белкалгасбуду, як чужы элемэнт.

Зараз Парэмбскі апынуўся на службе ў Белпаляводсаюзе на пасадзе загадчыка крухмальнай часткі.

Трэба адзначыць, што Парэмбскі да Калгасбуду працаваў на Бярэзьнікаўскім хэмкамбінаце, быў зьнят там з работы і апынуўся ў Менску ў Белхарчтрэсьце, дзе зноў не пратрымаўся і быў зьняты з работы, як гультай.

С. ГАРСКІ.

З-ці тыраж выйгрышаў З-й пазыкі індустрыялізацыі ў Менску

З жніўня г. г. у горадзе Менску адбудзецца тыраж выйгрышаў З-й пазыкі індустрыялізацыі.

Прэзыдыум ЦВК БССР для правядзеньня тыражу выйгрышаў стварыў тыражную камісію ў наступным складзе: т. т. Хацкевіч (старшыня камісіі), Мікуліч, Вансоўскі, Аксючыц, Ляўкоў, прадстаўнік ад НКФ СССР, Вольпава, Аверын, Бурава, Рындзіч, Лакціонаў, Яршоў, Дабравольскі, Вайцэхоўскі, Мітлін, Янаўлеў, Кучынскі, Дунец, Шукевіч, Гурэвіч, прадстаўнікі ад рабочых заводаў — «Дрэваапрацоўшчык», «Бальшавік», «Кастрычнік», «Камунар», «Чырвоная Зорка» (Менск), «Чырвоная Бярэзіна» — Барысаў, «Пралетары» — Гомель, «Мэтпром» — Віцебск, Асінбуду, ф-кі «Спартак»—Шклоў, дрэваапрацоўчанага камбінату—Бабруйск, чыгуначнікаў —Воршы і Менску, ад калгасьнікаў «Ленінскі Шлях», Магілеўскай акругі, Сьмілавіцкага раёну, калгасу «Расьсьвет —Пераможца», Бабруйскай акругі, арцелі імя Сталіна, Віцебскай акругі, камуны «Праца», Мазырскай акругі і ад саматужнікаў гор. Менску.

Дрэнна скарыстоўваюцца сродкі самаабкладаньня

Прэзыдыум АВК адзначыў дрэнная становішча з выкарыстоўваньнем сродкаў самаабкладаньня. Ні адна з акруговых устаноў гэтым пытаньнем ня цікавілася. Загадчыку акрфа, які ня прыняў мер да скарыстаньня сродкаў ад самаабкладаньня і нават ня ведаў, у якім становішчы знаходзіцца гэтая справа, абвешчана вымова.

Тэкстыльны тэхнікум у Воршы

Сёпета ў Воршы адкрываецца тэкстыльны тэхнікум. Заняткі ў тэхнікуме пачнуцца 15 верасьня.

Дырэктарам тэхнікуму назначаны тав. Грымбэрг.

З лістоў рабселькораў

У АДНЭЙ РУЦЭ—МОЛАТ, А Ў ДРУГОЙ—ВІНТОЎКА

Асоавіяхімаўская ячэйка пры Асінбудзе шырока разгарнула вайсковую вучобу. Зараз арганізаваны дзьве роты, якія аб'ядноваць 500 рабочых. Мабілізаваны ўвесь камандна-палітычны склад, які маецца на будаўніцтве, для кіраўніцтва гэтымі ротамі. Заняткі ў гэтых ротах праходзяць добра. Праз кожныя 3 дні, праводзяцца тактычныя заняткі.

Цяпер рыхтуюцца да выхаду ў поле. Дысцыпліна, якая раней была слабавата, узьнята на належную вышыню. Зацікаўленасьць з боку рабочых заняткамі—вялікая. Аб гэтым сьведчыць факт акуратнага і своячасовага наведваньня заняткаў.

П-кі.

УЗМАЦНЯЕЦЦА СУВЯЗЬ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ З РАБОЧЫМІ

1-шы дывізіён №-скага артпалку заключыў дагавор па сацспаборніцтве з рабочымі мэблёвай фабрыкі імя Халтурына (Магілеў). Чырвонаармейцы абяцаліся падрыхтаваць байцоў па ўсіх галінах спэцыяльнай баявой і палітычнай вучобы, давесьці да кожнага байца плян вучобы і г. д. Рабочыя з свайго боку абяцаліся выканаць і перавыканаць прамфінплян, паленшыць якасьць прадукцыі, давесьці прамфінплян да варштату, да кожнага рабочага.

Апрача гэтага абвешчана спаборніцтва на лепшую распрацоўку пастановы XIII зьезду КП(б)Б і XVI зьезду УсеКП(б).

Гэтымі днямі адбылася першая праверка выкананьня дагавору. Пры праверцы выявілася, што спаборніцтва дало добрыя вынікі. Прамфінплян на фабрыцы выкананы на 120 проц., замест 50-цпроцантнага выкананьня пляну да заключэньня дагавору.

Чырвонаармейцы маюць добрыя вынікі сваёй работы.

Шкляр.

БЕЗ ПРАКТЫЧНЫХ ВЫНІКАЎ

15-га ліпеня скончыўся месячнік торфу. Па Слуцкім раёне гэты месячнік торфу. ніякіх практычных вынікаў з гэй прычыны, што вакампаніі ня была завострана Рэвмадзкасьці. Каапэрацыйныя арганізацыі і камісія па садзейнасьці скарання торфу таксама не зьвярнулі належнай увагі на гэту работу.

У выніку—агульна-раённы планкан на апале на 29 проц. і на торфі на 4 проц. Гэтыя лічбы характарызуюць усю бязьдзейнасьць раённых арганізацый у гэтай галіне работы.

Сезон торфараспрацовак яшчэ не скончыўся. Патрэбна хоць зараз мобілізаваць усе сілы на выкананьне плану торфараспрацовак, бо з ім зьвязана таньне забесьпячэньня ў дастатковай колькасьці тарфаваным паліваным вугнасьньнем раёну.

Кіпер.

БЯЗ КІРАЎНІЦТВА І ДАПАМОГІ

Культасьветная работа ва Ўсім раёне (Полацкая акруга) пастаўлена надзвычай дрэнна. Усе хатнія і нардамы раёну працуюць без нагляду з боку палітпросьветаў. На працягу больш году ня было ніводнай нарады хатнікаў і ім прыходзіцца працаваць самацёкам, бяз кіраўніцтва рэктыў і кіраўніцтва.

Асабліва дрэнна абстаіць справа літаратурай на бягучыя тэмы, а гэтым адсутнічае ва ўсіх хатнях.

«НАМ ЗАРАЗ НЯМА ЧАСУ»

Аршанскі завод мэталістых працуе над с.-г. арцелью «Чырвоная Шэфства гэтае ён выконвае ... паперы. Напрыклад, у часе пасадкі да ўборкі, арцелі патрэбна ... мантаваць уборачныя прылады. ... зьвярнулася з гэтаю мэтай да ... заводу. Шэф «міласьліва» адказ... зараз няма часу». Прышлося ... здаць шэфу другіх калгасаў—... станцыі Ворша.

С. Халіма...

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЁНЬНЯ.

— Дом Камасьветы. А 7 гадз. веч. адбудзецца групавая кансультацыя для кіраўнікоў гурткоў па прапрацоўцы XVI зьезду УсеКП(б) у пак. № 19.

ЗАЎТРА.

— Дом Асьветы наладжвае вялікую экскурсію асьветнікаў разам з падшэфнай чырвонаарм. часткай за горад у Дразды. Увесь час будзе граць духавы аркэстр. Працуе буфэт. На экскурсіі будуць паказаны дасягненьні чырвонаармейцаў і масавая гульня. Збор у садзе Асьветы а 9 гадз. раніцы.

— ЦСПСБ. А 7 гадз. веч. сэктар вытворчасьці і зарплаты ЦСПСБ сумесна з Менскай інспэкцыяй працы склікае нараду па пытаньнях:

1. Дзяржнармаваньне зарплаты канторскага апарату прадпрыемстваў і 2. Цякучасьць рабсілы.

Выклікаюцца прадстаўнікі наступных аб'яднаньняў і прадпрыем.: ф-кі «Кастрычнік», зав. «Энэргія», «Камунар», «Дрэваапрацоўшчык», «Бальшавік», «Беларуская», «Пралетары», хлебазаводу, абутковай ф-кі, біржы працы, Наркампрацы, Будаб'яднаньня, Лесхэмаб'яднаньня, Мэталёаб'яднаньня, ВСНГ, Торфаб'яднаньня, Белхарчтрэсту, Скураб'яднаньня і прадстаўнікі ЦП саюзаў.

— ЦСПСБ. А 10 гадзін раніцы вытворчасьці і зарплаты ЦСПСБ на з Наркампрацы склікае нараду пытаньні падрыхтоўкі да забесьпячэньня спэцвопраткай на новы 1930 г. падарчы год. На нарадзе будуць заданы інфармацыі: Наркамгандлю, Каапсаюзу, Белпайгандлю.

Выклікаюцца прадстаўнікі ... арганізацый: Наркамгандлю, Белгандлю, Белкаапсаюзу, ВСНГ, ... Торфаб'яднаньня, Будаб'яднаньня, Скурсьнідыкату і ЦП саюзаў, ... дрэваапрацоўшчыкаў і хэмікаў.

— А 7 гадз. веч. назначаецца ... 1-га і 2-га атрадаў Асоавіяхіму імя Блохэра, таксама рэзэрву і курсантаў. ... ў форме абавязкова.

ПАПРАЎКА.

У аддзеле «Пазыка «Піяніера» ... тыры гады» ў подпісы пад замест ... Пухавіцкім раёне рэалізацыя пра... ца», зьмешчанай у № 172 ад 26 ... дапушчана памылка: замест ... «Кіст» надрукаваны подпіс «Б-...

Час. вык. абав. адказ. рэдактара А. Мітк...

Мясцком і супрацоўнікі Белсельтрэсту выказ... ваць спачуваньне супрацоўніку Белсельтрэсту К. А. Казарэўскаму з прычыны неспадзяванай сьмерці

ЯГО ЖОНКІ

Рэкамандуемы сьпіс карцін

Да Міжнароднага Чырвонага Дня—1 жніўня 1930 г.

РЭВАЛ. РУХ У КАПІТАЛІСТЫЧНЫХ КРАІНАХ
1. Шанхайскі дакумант—5 част.
2. Здань, якая не варочаецца—7 част.
3. Блакітны экспрэс—5 част.
4. Да заўтрага—7 част.
5. Гандляры славай—6 част.
6. Кашэль дыкур'ера—7 част.
7. Саламандра —7 част.
8. Джымі Хігінс—8 част.
9. Барыслаў сьмяецца—7 част.

ГІСТАРЫЧНА-РЭВАЛ. ФІЛЬМЫ (ГРАМАДЗЯНСК. ВАЙНА)
1. Кастрычнік—7 част.
2. Спад дынастыі Раманавых—6 част.
3. Браненосец Пацёмкін—7 част.
4. Патомак Чынгіс-Хана—8 част.
5. Арсэнал—7 част.
6. М а ц і—7 част.
7. М я ц е ж—6 част.
8. Сорак першы—7 част.
9. Два дні—7 част.
10. Навальніца—6 част.
11. Вялік шлях—9 част.
12. Хвоі гамоняць—6 част.
13. У тылу ў белых—9 част.
14. В ы б у х—6 част.
15. У агні народжаная—5 част.
16. Новы Вавілён—8 част.
17. Два бранявікі—6 част.
18. Абрэк Заур—10 част.
19. Транспарт агню—7 част.
20. Э л і с о—6 част.
21. Масква ў Кастрычніку—7 част.
22. Машыністы Ўхтомскі—6 част.
23. Канец С.-Пецярбурга—7 част.
24. К а т а р г а—7 част.
25. Залатая дзюба—6 част.
26. Яго яснавяльможнасьць—6 част.
27. Дарога ў сьвет—6 част.
28. Д ж а н к і—2 сэр.
29. У сумётах—6 част.
30. В е ц е р—7 част.
31. Справа № 128—5 част.
32. Бэнэфіс клёўна Джорджа—6 част.
33. Дом на вулькане—6 част.
34. Дні барацьбы і перамог—5 част.
35. Не шлях—7 част.
36. З а м а л у—7 част.
37. Чырояныя чарцаляняты—2 сэрыі.
38. Крыты фургон—8 част.
39. Леон Куцор'е—6 част.
40. Лясная быль—8 част.
41. Мітрошка — салдат рэвалюцыі —6 част.
42. Мост праз Вып—5 част.
43. Начны рамізьнік—6 част.
44. Першы карнет Страшнеў—6 част.
45. Пэрагон сьмерці—6 част.
46. Апошні атракцыён—6 част.
47. Шаснаццаты—6 част.
48. Гатэль Савой—7 част.

САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ БУДАЎНІЦТВА (Індустрыялізацыя, калектывізацыя с.-г., клясавая барацьба ў вёсцы)
1. Г і г а н т—5 част.
2. Старое і новае—6 част.
3. Аблочнак імперыі—6 част.
4. В і р—6 част.
5. Беларусь—5 част.
6. Маніфэст ЦВК—5 част.
7. Дзяўчына з далёкай ракі—6 част.
8. Гэрої Домны—7 част.
9. Дзяльма—6 част.
10. Адзінаццаты—5 част.
11. Пяцігадовы плян—6 част.
12. Сьветлы горад—6 част.
13. Сьмяецца жыньцё—6 част.
14. Краіна Чуваская—6 част.
15. Цэмэнт—6 част.
16. Шостая частка сьвету—6 част.
17. К р э п ы ш—6 част.
18. Х т о к а г о—7 част.
19. Матрос Галай—6 част.
20. Новым шляхам—6 част.
21. Заваяваная зямля—5 част.
22. Песьня вясны—7 част.

АБАРОНА СССР (Чырв. армія, Чырв. флёт)
1. А. Д. У. А.—6 част.
2. Хэмічная аружжа—5 част.
3. Т а н к і — 5 част.
4. Пяць у яблачка (крок за крокам)—6 част.
5. Палоньнікі мора—7 част.
6. Чырв. армія на варце СССР — 5 част.
7. Кітайскі млын—5 част.
8. Два супрацоўнікі—6 част.
9. Штурм з неба—6 част.
10. У чырвоным коле—6 част.

БЕЛДЗЯРЖКІНО.

Летні тэатр саду „Прафінтэрн"

27-га ліпеня — 28-га ліпеня

ПАПУЛЯРНЫЯ КАНЦЭРТЫ

Сымфанічнага аркестру Белрадыёкомітэту

пад кіраўніцтвам дырыжора М. В. МІХАЙЛАВА

пры ўдзеле М. А. Баравік (скрыпка).

ПРАГРАМА 27-ГА ЛІПЕНЯ
1-е аддз.
ГЛІНКА—ув. «Руслан і Людміла».
ОФЭНБАХ—Баркарола з оп. «Казкі Гофмана».
БІЗЭ—Антракт і ув. з оп. «Кармэн».
ГЛАЗУНОЎ—Палёнез на руск. тэму.
2-е аддз.
ВЭБЭР—Ув. Обэрон
ТАЛЛАМ—Сэрэнада.
ШТРАУС—«Вясен. галасы». Вальс.
РУБІНШТЭЙН—«Свадебн. шествие» з оп. «Фэрамос».

ПРАГРАМА 28-ГА ЛІПЕНЯ
1-е аддз.
АРЭНСКІ—Ув. «Сон на Волге».
НАПРАЎНІК—Інтэрмэцо з оп. «Дуброўскі».
МАНІКОЎСКІ—2 гішпанскіх танцы
МЭЙЕРБЭР—Марш «Пророк».
2-е аддз.
ЗУППЭ—Ув. «Дама пік».
ЧАЙКОЎСКІ—Андантэ кантабіле.
ЧАЙКОЎСКІ—Вальс з балету «Лебедзь возера».
РЫМСКІ-КАРСАКОЎ—Танец шутоў з оп. «Сьнягурачка».

Білеты ў раб. касе, а ў дзень канцэрту ў касе тэатру з 6 гадз. вечару.
Пасьля пачатку канцэрту ўваход у залю бязумоўна забаронены.
Пачатак у 9 гадз. веч.

Адміністрацыя тэатру

БЕЛАРУСКАМУ ДЗЯРЖАЎНАМУ ВЫДАВЕЦТВУ ПАТРЭБНЫ на сталую працу

СТЫЛЬРЭДАКТАРЫ І КАРЭКТАРЫ,

якія вельмі добра ВЕДАЮЦЬ БЕЛАРУСКУЮ МОВУ І ПРАВАПІС.

Залічэньне на працу будзе адбывацца пасьля спробнае работы.
Залічаным на працу ПРАЕЗД БУДЗЕ АПЛАЧАНЫ.
АПЛАТА працы: стыльрэдактара—140 руб. на месяц.
карэктара —120 руб. „
Апрача гэтага ДАЕЦЦА ЗЬДЗЕЛЬНАЯ СТЫЛЬРЭДАКЦЫЯ І КАРЭКТУРА.
Аплата зьдзельнае ст. рэдакцыі: 5, 7 і 10 руб. за аркуш, карэктуры—2, 5 і 3 руб. аркуш.
З прапановамі зьвяртацца ў выдавецкі аддзел БДВ, Савецкая, 63.

КІНО „СПАРТАК"

АМЭРЫКАНСКІ БАЯВІК ГІШПАНСКАЯ ТАНЦОРКА

гістарычны кіно-фільм у 8 частках
У галоўнай ролі ПОЛІ НЭГРЫ
Пачатак сэансаў:
1-га сэансу а 7 г.,
2-га сэансу а 9 г.,
3-га сэансу а 10 г. 45 м.
КАСА—ад 6 гадз.

Кіно-тэатр „Культура"
З ПРЫЧЫНЫ ВЯЛІКАГА ПОСЬПЕХУ 2-гі ТЫДЗЕНЬ
ДАЧКА ГІЛЯНА
драма ў 8 частках
— ЗВЫШ ПРАГРАМЫ —
апошнае дасягненьне тэхнікі жывога кінематографа
Дзеля ўспрыняцьця эфэкту кожны глядач атрымоўвае спэцыяльныя акуляры ў касе кіно (па сабекошту) 7 к. за штуку.
ЦУДОЎНЫЯ ЦЭНЫ
Пачатак сэансаў: 7 гадз., 9 гадз., 10 г. 30 м.

Кіно Інтэрнацыянал
СЁНЬКЯ І ШТОДНЯ
нямецкі фільм
ДЗЕЛЯ ДЗІЦЯЦІ (КРЫВАПРЫСЯГА)
Пачатак 1-га сэансу а 7 г. 30 м.
Каса адкрыта з 5 г. 30 м.

Кіно Пралетары
ЗАМЕЖНЫ ФІЛЬМ
ЧАЛАВЕК АГНЮ
Пачатак 1-га сэансу а 7 г.
Каса адкрыта з 5 г.

Кіно-сад
Лепшая камэдыя сэзону
ЛЯЛЬКА З МІЛЬЕНАМІ
Пачатак 1-га сэансу а 10 гадз.
Каса адкрыта з 6 гадз. 30 м.

З 1-га жніўня па 5-га верасьня г. г. адкрываецца прыём заяў ад асоб жадаючых паступіць

У Менскі дзяржаўны тэхнікум фізкультуры

Тэрмін навучаньня 3-х гадоў.

Жадаючыя паступіць павінны прадставіць усе дакументы згодна даведніка НКАБ. Акрамя таго паступаючыя праходзяць мэдагляд пры ўрачэбных табінэтах, здаюць іспыты па фізічнай падрыхтоўцы, атрымоўваюць анкеты і ўсе даведкі ў Акр. Саветах Фізкультуры.
Усе заявы накіроўваць на адрасе: Менск. абанэмент. штов. скрыпка № 65.

АДМІНІСТРАЦЫЯ.

МИКРОБИОЛОГИЧЕСКИЙ научно-исследовательский ИНСТИТУТ Наркомпроса
— ОБЪЯВЛЯЕТ: —
О НАБОРЕ АСПИРАНТОВ
— ПО ОТДЕЛЕНИЯМ: —
1. Иммуно-Биологическое.
2. Медицинской бактериологии.
3. Медицинской протистологии.
4. Общей бактериологии.
5. Общей протистологии.
6. Синтеза хемотерапевтических препаратов.
7. Ветеринарной бактериологии и гельминтологии.
Условия приема согласно правил, опубликованных Наркомпросом РСФСР в „Правде" от 15-VII—30 г. № 193.
Заявления со всеми документами адресовать: Москва, 48. Мал. Пироговская 57.
Зам. Директора Ин-та М. БАСКИН.

ЗАВОЧНЫЯ БУХГАЛЬТАРСКІЯ КУРСЫ
Прыём слухачоў праводзіцца круглы год.
Прымаюцца асобы з 17-гадовым узростам з асьветай на ніжэй 5 гр. 7-годкі.
ПЛАТА ЗА КУРС 33 руб.
праводзіцца так: 9 руб. пры паступленьні на курсы, з якіх 4 руб. залічваюцца за 8-ы месяц і па 4 руб. на працягу 6 месяцаў у пачатку кожнага навучальнага месяца
Заявы, запытаньні і грошы накіроўваць па адрасе: Менск, пошта, скрынка 44, Завочным курсам.
На адказ прыкладаць 2 маркі па 10 кап.

СЕКАРОВСКАЯ ЖИЖАСТЬ
МОСКВА 65/2 ВЫШЕСЛАВЦЕВ ПЕР. 15

АД'ЯЖДЖАЮЧЫ Ў ВОДПУСК
у дом АДПАЧЫНКУ, на КУРОРТ,
атрымлівайце газ. „ЗЬВЯЗДА"
па месцы знаходжаньня ў водпуску,
паведамляючы 9 аддзел подпісі газ. «ЗЬВЯЗДА»
ВАШ НОВЫ АДРАС.
Газэта будзе дасылацца на новым адрасе
без асобнай даплаты.

ЛЯЧЭБНІЦА — МЕНСКАГА КАМІТЭТУ ГАРАДЗКОГА УЗАЕМАДАПАМОГІ
Ленінская, № 25, побач з 2-м Домам Саветаў, ...
АДКРЫТА ад 9 гадз. ран. да 9 г. ...
Прыём хворых па ўсіх спэцыяльнасьцях:
па ўнутравых, хірургічных, жаночых, вочных, хваробах вушэй, горла і носа, скурана-венэрычных, страўніцкіх, нэрвовых.
Электра-сьвета-лячэньне і кварц адкрыты з 11—2 гадз. ... і 5—8 гадз. увеч.
Рэнтген (здымкі, прасьвечваньні, лячэньне) адкрыт з ... 30 м. да 9 г. увеч.
Прыём хаміка-бактэрыялёгічных аналізаў. Аптэка.
ЗУБНЫ ГАБІНЭТ адкрыт з 9 г. раніцы да 9 г. ... штодня.
Кансультацыя прафэсароў па ўсіх спэцыяльнасьцях ... папярэднім запісе.
Урачэбная дапамога на даму па ўсіх спэцыяльнасьцях. Запісь з 9 гадз. раніцы да 2 гадз. дня.
Дзяжурствы дактароў з 2 гадз. дня да 9 гадз. увеч.
Начное дзяжурства дактароў ад 9 гадз. увеч. да 7 гадз. раніцы.
Прыём хворых па лекавых кніжках камітэтаў.
Для ўсіх іншых грамадзян за агульнадаступную дыфэрэнцыраваную плату.

КІРАЎНІЦТВА АШЧАДКАСАМІ БССР
апавяшчае, што пастановай ураду,
ТЭРМІН РЭАЛІЗАЦЫІ ВЭЛЕСЫПЭДНЫХ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ
ПРАЦЯГНУТ

да 15 жніўня
10 проц. вэлёсыпэдаў 4-й сарыі—жаночыя.
Працоўныя, сьпяшайцеся набыць у растэрміноўку вэле-абавязацельства для атрыманьня вэлесыпэду.
Калектыўная і індывідуальная падпісна прымаецца ва ўсіх ашчадкасах.

АД УСЕБЕЛАРУСКАЙ КАНТОРЫ ДЗЯРЖБАНКУ
АБ'ЯВА.
На падставе пастановы праўленьня Дзяржбанку даводзіцца да ведама ўсей кліентуры канторы і філіялаў Дзяржбанку па БССР, што
ПАЧЫНАЮЧЫ з 1-га ЖНІЎНЯ г. г.
А) Рахункі на суму ніжэй 50 руб. банкам прымацца ня будуць.
УВАГА: У тых выпадках, калі на працягу месяцу па рахунку пастаўшчыка ня накопіцца сума у 50 руб., тады дазваляецца прымаць рахункі і на меншыя сумы, але ня ніжэй 25 руб.
Б) Рахункі на суму ад 51 да 500 руб. павінны аплачвацца кліентурай разьліковымі чэкамі без прадстаўленьня рахункаў у банк, але з паказаньнем у чэках: „Разьлік за тавары".
УСЕБЕЛАРУСКАЯ К-РА ДЗЯРЖБАНКУ.

ТЭРМІНОВА патрабуюцца мэдыцынскія працаўнікі для Віцебскага ...
Доктар—загадчык больніцай—пэнсія 300 р.
Зубны доктар, фэльдшэрыцы, акушэркі—пэнсія ...
Прапановы з дакумантамі накіроўваць у Белазет, ... Савецкая, 70.
Асабістыя даведкі ў д-ра Дзіцкіра (Інстытут Яхоны ... тэл. № 12-93, рог К. Маркса і Энгельса № 44-23).

Менск. Гапоўлітбел № 337.

Друкарня газ. «Зьвязда» Менск.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2